ЧУЖЫЯ ДЗЕЦІ...
ЯНЫ Ж — СВАЕ
7

ЯГУАР ПАКУЛЬ
«ХАЛАСЦЯКУЕ»
12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ЛЮТАГА 2021 г. СУБОТА № 38 (29407)

ЦЫТАТА ДНЯ

Іван КРУПКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:

«Падыходы і асноўныя параметры развіцця арганізацый АПК на 2021 год ужо вызначаны. У прыватнасці, урадам прадугледжваецца рост экспартных паставак на 4,3 %. Наяўны вытворчы патэнцыял пры правільным і эфектыўным яго выкарыстанні дазволіць забяспечыць рост валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў гаспадарках усіх катэгорый не менш чым на 2,4 %, у тым ліку ў сельскагаспадарчых арганізацыях — на 2,9 %, прамысловай вытворчасці — на ўзроўні 2 %».

КАРАТКА

- **Прадукты харчавання ў 2020 годзе забяспечылі пятую частку беларускага экспарту тавараў.**
- Мінфін чакае другі транш расійскага крэдыту ў I паўгоддзі.
- **У Віцебску адкрылі абноўлены хірургічны корпус абласнога анкадыспансера.**
- Выкарыстанне торфу плануецца пашыраць у цэментнай галіне і ЖКГ.
- **Гомельскі медуніверсітэт пачне рыхтаваць эпідэміёлагаў і гігіеністаў.**
- У Брэсце выяўлены пражыванне і зімоўка адной з рэдкіх птушак беларускай фаўны — сокала-падарожніка, самай хуткай птушкі на планеце.



- **Мядзведзі Трыстан і Нюра выйшлі са спячкі ў Мінскім заапарку.**

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы паедзем у Токіа змагацца, нам будзе няпроста»

Алімпійскі сход стаў пляцоўкай для абмеркавання важных спартыўных пытанняў

Фота БелТА.

У штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта адбыўся Алімпійскі сход з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Кіраўнік дзяржавы, адкрываючы пасяджэнне, адзначыў: «Настаў час зноў абмеркаваць праблемы развіцця спорту і алімпійскага руху, абнавіць склад і кіраўніцтва НАК».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь перажывае няпросты перыяд: «Наша краіна, людзі падвяргаюцца надзвычай жорсткаму ціску па ўсіх напрамках... У гэтую варонку зацягнула, на жаль, і некаторых спартсменаў, у асноўным былых. Менавіта з іх падачы Беларусь страціла чэмпіянаты свету па хакеі і сучасным пяцібор'і. А яны атрымалі свае 30 срэбранікаў. ***Скажу адно: на здрадзе Радзімы шчасця не пабудуеш.*** Ну, бог ім суддзя».

Шмат увагі негатыўным момантам Аляксандр Лукашэнка не стаў аддаваць, падкрэсліўшы, што беларусы ўсё перажываць. Абсалютную большасць спартсменаў Прэзідэнт назваў сапраўднымі патрыётамі, якімі можна ганарыцца і якія аддаюць свой талент, сілы і энергію для перамог у імя нашай Айчыны. «Менавіта праз вашы намаганні ствараецца спартыўная слава Беларусі. Вам прымаць рашэнні аб далейшым развіцці алімпійскага руху ў краіне, вызначаць прыярытэты ў рабоце, даваць ацэнку зробленаму. Менавіта з вас будуць браць прыклад новыя пакаленні беларускіх спартсменаў», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да тых, хто зараз рыхтуецца да галоўных стартаў.

СТАР. 2

Вясна на парозе

Фота БелТА.

А калі сумняваецеся — паглядзіце на гэтае фота. Перад жаночым святам у фірменнай гандлёвай сетцы «Магілёўзелянбуд» адных толькі цюльпанаў будзе прадстаўлена восем тысяч штук. А яшчэ ж ёсць ружы, хрызантэмы, лілеі, касачы, герберы — усяго каля 18 тысяч кветак. Аграном Галіна ЯЗЕРСКАЯ дакладна ведае: вясна ўжо тут!

Кампетэнтна

Ірына ВАРАНОВІЧ:

«У БЕЛАРУСІ БЕЗЛІЧ МЕСЦАЎ, ВАРТЫХ УВАГІ ТУРЫСТАЎ»

Сусветная турысцкая арганізацыя (ЮНВТА) адзначыла, што летась галіна перажыла найгоршы год за ўсю гісторыю назіранняў. Па звестках арганізацыі, сектар турызму страціў 1,3 трыльёна долараў ЗША, пад пагрозай аказалася ад 100 да 120 мільёнаў рабочых месцаў. Але няма ліха без дабра. Беларусы нарэшце змаглі лепш пазнаёміцца са сваёй краінай. Мінулы 2020 год закрыў граніцы, але адкрыў вочы на тое, што побач. Як беларуская турыстычная сфера справілася з выклікамі часу і якія ўрокі з гэтага вынесла, «Звяздзе» расказала Ірына ВАРАНОВІЧ, дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Мы паедзем у Токіа змагацца, нам будзе няпроста»

«ПАТРЭБНЫ БАЯЗДОЛЬНЫ «ДЭСАНТ»

«Для спартсменаў і трэнераў зроблена ўсё магчымае і нават больш у гэтых няпростых умовах. Таму першачарговая задача на найбліжэйшыя месяцы — сфарміраваць баяздольны спартыўны «дэсант» у Токіа. Апраўданні не прымаюцца, і быць увогуле іх не можа. Нам, сапраўды, патрэбны баяздольны «дэсант». ***Мы паедзем у Токіа змагацца, нам будзе няпроста. Як і Расію, нас будуць плюшчыць з усіх бакоў. І мы павінны вытрымаць»,*** — заявіў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба ўлічваць — Алімпійскія гульні будуць праходзіць ва ўмовах беспрэцэдэнтных антыковідных мер і абмежаванняў. Па яго словах, усім трэба быць гатовымі да вырашэння звязаных з гэтым пытанняў акліматызацыі спартсменаў, дастаўкі дэлегацыі і грузаў у Алімпійскую вёску, арганізацыі трэніровак, побыту, медыцынскага абслугоўвання. Прэзідэнт расказаў, што ён даўно ўзгадніў графікі, месцы пражывання спартсменаў на Далёкім Усходзе Расіі. Садзейнічанне спартсменам Беларусі ў гэтым аказаў губернатар Прыморскага краю Алег Кажамяка. Такія меры неабходныя для паспяховай акліматызацыі спартсменаў. «Там 150—200 кіламетраў да Японіі. І вы практычна будзеце жыць у тых жа ўмовах», — адзначыў кіраўнік краіны.

«УСЕ СТАВЯЦЬ ПЕРАД САБОЙ АМБІЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ»

Прэзідэнт пацікавіўся: «Якія высновы зроблены пасля Рыа-дэ-Жанейра? Якія прыняты меры па ліквідацыі недахопаў у падрыхтоўцы спартсменаў? Чаканняў і абяцанняў, як заўсёды, шмат...» Адказы на гэтыя пытанні даў у сваім дакладзе міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Сяргей Кавальчук. Ён падкрэсліў, што нязменна галоўнай задачай усёй спартыўнай сферы застаецца фарміраванне моцнай каманды на Алімпійскія гульні. На заключным этапе падрыхтоўку да Алімпійскіх гульняў у Токіа вядзе каля 260 беларускіх спартсменаў па 26 відах спорту. На сёння кваліфікацыйныя патрабаванні і нарматыў для ўдзелу ў Гульнях 2021 года выканалі 74 беларускія атлеты ў 16 відах спорту. Да заканчэння адборачнага этапу плануецца заваяваць 110-120 ліцэнзій.

«Вялікія надзеі ўскладаем на веславанне на байдарках і каноэ, віды барацьбы, цяжкую атлетыку, мастацкую гімнастыку, скачкі на батуце, сучаснае пяцібор'е, тэніс. Разлічваем на беларускіх плыўцоў і лёгкаатлетаў, якія хутка прагрэсіруюць. Медальныя перспектывы маюць як знакамітыя беларускія атлеты, так і цэлая плеяда маладых атлетаў. Дынаміка выступленняў нашых спартсменаў падчас алімпійскага цыкла дазваляе казаць аб дастатковай эфектыўнасці падрыхтоўкі да галоўных стартаў, улічваючы што ў 2020 годзе выступленні спартсменаў на міжнародных стартах былі абмежаваны з вядомых прычын», — расказаў міністр.

Сяргей Кавальчук пералічыў меры, якія ўжо прыняты для арганізацыі плённай падрыхтоўкі спартсменаў да галоўных стартаў. У лютым 2020 года ў мэтах стымулявання высокіх спартыўных вынікаў было прынята распараджэнне кіраўніка краіны, якое ўстанаўлівае памеры ўзнагароджання за вынікі Алімпійскіх, Паралімпійскіх і Дэфлімпійскіх гульняў. Дадатковы стымул да спартсменаў — імянныя стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У адсутнасць афіцыйных стартаў па просьбе спартыўнай супольнасці Прэзідэнт працягнуў на год іх выплату кандыдатам на ўдзел у Алімпіядзе і іх трэнерам. Па выніках выступленняў у 2020 годзе былі актуалізаваны саставы нацыянальных каманд і спісы кандыдатаў на ўдзел у Гульнях, у некаторых відах спорту былі прызначаны новыя галоўныя трэнеры. Напярэдадні Алімпійскіх гульняў востра стаіць пытанне барацьбы з допінгам. З гэтай нагоды распрацавана антыдопінгавая праграма, у цэнтрах алімпійскай падрыхтоўкі і спартыўных федэрацыях па відах спорту прызначаны адказныя за антыдопінгавую дзейнасць. У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры спорту створаны каардынацыйны савет, які кантралюе падрыхтоўку спартсменаў да Алімпійскіх гульняў.

Пасля даклада міністра спорту свае меркаванні аб важных спартыўных праблемах выказалі вядомыя прадстаўнікі галіны. Старшыня Беларускай асацыяцыі студэнцкага спорту, алімпійскі чэмпіён Аляксандр Багдановіч падкрэсліў, што спартсменам неабходна абстрагавацца ад сітуацыі навокал і быць сканцэнтраванымі на сваіх выступленнях. Пагадзіўся з ім і алімпійскі чэмпіён Андрэй Барбашынскі. Ён таксама звярнуў увагу на развіццё дзіцяча-юнацкага спорту ў краіне: «У нас ёсць усе ўмовы, каб выхоўваць спартсменаў, трэба толькі працаваць у гэтым кірунку». Працягнуў гэтую тэму і старшыня Беларускай федэрацыі хакея Дзмітрый Баскаў. Па яго словах, на пачатковым этапе спартыўнай кар'еры варта звярнуць увагу на вопыт спаборніцтваў, асабліва міжнародных.

«Хацелася б, каб у нас было больш трэнераў-фанатаў. Большасць, прыходзячы на работу, не аддаецца ёй поўнасцю, адсюль і страты сярод маладога і сярэдняга пакаленняў спартсменаў», — падзялілася меркаваннем Вольга Уласава, галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па скачках на батуце.

«КРАДЗЯЖУ І КАРУПЦЫІ Ў НАК НЕ БУДЗЕ»

Другая частка алімпійскага сходу была прысвечана дзейнасці Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Старшыня рэвізійнай камісіі НАК Ігар Кацібнікаў далажыў аб фінансавай дзейнасці арганізацыі ў 2019—2020 гадах. Падчас Алімпійскага сходу ўнесены змяненні і дапаўненні ў Статут НАК Беларусі. У прыватнасці, згодна з імі вышэйшым органам камітэта будзе Генеральная Асамблея НАК, улічаны таксама пытанні гендарнай роўнасці ў складзе выканкама НАК.

Галоўнай падзеяй Алімпійскага сходу стала абранне новага прэзідэнта НАК. Членамі выканаўчага камітэта Нацыянальнага алімпійскага камітэта былі прапанаваны дзве кандыдатуры на гэтую пасаду — Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Лукашэнкі. «Я не планаваў абірацца на чарговы тэрмін кіраўніком Алімпійскага камітэта. Папрашу вас, калі вас гэта задаволіць, перадаю вам свайго старэйшага сына. ***Абяцаю, што крадзяжу, карупцыі, нямэтавага выкарыстання грошай не будзе. І адносіны да спартсменаў і трэнераў будуць самыя добрыя.*** Што датычыцца мяне, я ж усё роўна нікуды не адыду ад пытанняў спорту. І самае галоўнае, вы ж шмат чуеце размовы: транзіт улады, зараз Лукашэнка старэйшаму як мінімум перадасць уладу, ён будзе кіраваць у краіне. Я часта казаў, што ў нашай сям'і гэта ніколі не абмяркоўвалася і абмяркоўвацца не будзе. Таму што ні адно маё дзіця Прэзідэнтам у Беларусі не будзе пасля мяне. І Віктар, калі вы яго абераце, не будзе дзяржаўным служачым. Ён сёння ж будзе звольнены з пасады памочніка Прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Новы прэзідэнт НАК Беларусі Віктар Лукашэнка адзначыў, што гэтая пасада ўскладае на яго вялікую адказнасць. Ён запэўніў, што НАК сумесна з Мінспорту, федэрацыямі і іншымі зацікаўленымі зробяць усё магчымае, каб беларусы дастойна выглядалі на любых спартыўных арэнах. Віктар Лукашэнка прапанаваў ліквідаваць пасаду першага віцэ-прэзідэнта НАК. Адзіным віцэ-прэзідэнтам абраны алімпійскі чэмпіён Дзмітрый Даўгалёнак.

Абноўлены састаў выканаўчага камітэта НАК Беларусі. У новы склад выканкама НАК увайшлі чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў Андрэй Барбашынскі, Аляксандр Багдановіч, Алена Зубрылава, Наталля Цылінская, Любоў Чаркашына, а таксама спартыўныя кіраўнікі Дзмітрый Баскаў, Аляксандр Бут-Гусаім, Ірына Малёваная, Дзяніс Мужухін. Старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання «Ветэраны фізічнай культуры і спорту», чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў Антаніна Кошаль была абрана ганаровым членам НАК Беларусі. Адразу пасля Алімпійскага сходу прайшло першае пасяджэнне новага складу выканкама НАК Беларусі.

«СПАРТСМЕНЫ ПАВІННЫ ПАДЗЯКАВАЦЬ НАРОДУ»

У канцы сходу старшыня Беларускай тэніснай федэрацыі Сяргей Цяцерын прапанаваў беларускім спартсменам аб'яднацца для дасягнення пастаўленых задач: «Напэўна, якраз той перыяд, калі нам трэба ўсім аб'яднацца і паспрабаваць на гэтай Алімпіядзе паказаць значна больш нашага сумеснага жадання перамагчы, ну і кожны няхай укладзецца ў свой від спорту», — сказаў ён.

Старшыня Беларускага альянсу танцавальнага спорту Антон Юспа прапанаваў вылучыць Аляксандра Лукашэнку на пасаду ганаровага прэзідэнта НАК. Кіраўнік дзяржавы адхіліў гэтую ініцыятыву. «Не трэба гэтага рабіць цяпер, бо мы зноў трапім пад крытыку, ведаеце чаму? А вось... сышоў і застаўся. Не трэба». Прэзідэнт пагадзіўся з Сяргеем Цяцерыным у тым, што зараз асаблівы час для беларускага народа. Ён параіў спартсменам і трэнерам быць патрыётамі, аб'яднацца і паказаць, што «мы маем права людзьмі звацца»: ***«Мы павінны паказаць, што мы нацыя.*** Вы павінны падзякаваць свайму народу за тое, што ён зрабіў для спартсменаў, каб яны маглі змагацца і выступаць».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Валерыя СЦЯЦКО.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША накіравалі $77 млн на барацьбу з унутраным тэрарызмам

Пра гэта заявіў міністр унутранай бяспекі ЗША Аляхандра Маёркас. «Сёння найбольш сур'ёзная тэрарыстычная пагроза, з якой сутыкаецца краіна, зыходзіць ад зламыснікаў-адзіночак і невялікіх груп асоб, якія здзяйсняюць акты гвалту, матываваныя ідэалагічнымі поглядамі, звязанымі з унутраным экстрэмізмам», — адзначыў кіраўнік Міністэрства ўнутранай бяспекі (МУБ) ЗША. У цэлым МУБ накіроўвае $1,87 млрд у выглядзе грантаў на барацьбу з тэрарызмам і шэрагам іншых сур'ёзных праблем, з іх не менш як $77 млн пойдзе на барацьбу з унутраным тэрарызмам. Сродкі атрымаюць улады штатаў і гарадскія муніцыпалітэты. Як адзначае інфармацыйны партал Axios, рашэнне вылучыць мільёны долараў на барацьбу з унутраным тэрарызмам было прынята ў ЗША ўпершыню.

Краіны ЕС дамовіліся аб стварэнні сертыфікатаў вакцынацыі ад коўіду

Лідары краін Еўрасаюза дамовіліся аб стварэнні электронных сертыфікатаў аб вакцынацыі ад каранавіруса. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва Reuters са спасылкай на заяву канцлера Германіі Ангелы Меркель. Па яе словах, Еўракамісіі спатрэбіцца каля трох месяцаў на стварэнне тэхнічнай асновы для сертыфікатаў. Такія дакументы дазволяць людзям свабодна перамяшчацца ўнутры ЕС. Па словах кіраўніка Еўракамісіі Урсулы фон дэр Ляен, якая мае вопыт медыцынскай работы, вакцынацыя павінна быць пацверджана дакументальна. І гэта датычыцца не толькі COVID-19, але і любой хваробы, ад якой трэба вакцынавацца. Пры гэтым Францыя і Германія выказалі сумненні з нагоды неабходнасці ўвядзення сертыфікатаў, бо няма вычарпальных даных аб эфектыўнасці вакцын.

Урад Індыі зрабіў больш жорсткім рэгуляванне сацсетак

Для стрымінгавых сэрвісаў і сацыяльных сетак уведзены правілы па ўрэгуляванні прэтэнзій грамадзян і дзяржаўных органаў, паведаміла The Times of India. Новыя правілы абавяжуць сацсеткі раскрываць першакрыніцу паведамлення па патрабаванні ўпаўнаважанага органа ўрада або суда. Для ўрэгулявання прэтэнзій да кантэнту ў інтэрнэце будзе ўведзена трохузроўневая сістэма кантролю. У правілах таксама прапісаныя тэрміны, падчас якіх адказныя асобы павінны будуць рэагаваць на прэтэнзіі або блакіраваць спрэчную інфармацыю. Стрымінгавыя сэрвісы абавязалі класіфікаваць кантэнт у залежнасці ад узросту.

Блізкая ўлада

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае на планавай аснове праводзіць выязныя прыёмы грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.

Пры гэтым нараўне з правядзеннем названых выязных прыёмаў у стацыянарных умовах райгарвыканкамаў больш шырока будуць практыкавацца сустрэчы з працоўнымі калектывамі прадпрыемстваў і арганізацый розных формаў уласнасці, пасля завяршэння якіх адбудуцца мэтавыя асабістыя прыёмы работнікаў гэтых прадпрыемстваў.

Выязныя асабістыя прыёмы будуць праведзены на працягу сакавіка 2021 года. **На наступным тыдні ў рэгіёнах такія сустрэчы з калектывамі прадпрыемстваў і асабісты прыём для іх работнікаў правядуць:**

памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Аляксеевіч МАРТЫНЮК — 1 сакавіка ў Магілёве на ААТ «Ольса» і 4 сакавіка ў філіяле «Ялізава» ААТ «Гродзенскі шклозавод» у Асіповіцкім раёне;

памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску Аляксандр Пятровіч БАРСУКОЎ — 2 сакавіка на сталічным ТАА «МотаВелаЗавод»;

памочнік Прэзідэнта па пытаннях развіцця фінансава-крэдытнай сістэмы Валерый Іванавіч БЕЛЬСКІ — 2 сакавіка ў Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі ў горадзе Горкі;

намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Мікалаевіч КРУТОЙ — 4 сакавіка на ААТ «Гомсельмаш» у Гомелі;

памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый Паўлавіч ВАКУЛЬЧЫК — 4 сакавіка на ААТ «Івацэвічдрэў» у горадзе Івацэвічы.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Святлане Васілеўне Паўлоўскай, кансультанту ўпраўлення электронных сродкаў масавай інфармацыі і інтэрнэт-рэсурсаў Міністэрства інфармацыі, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Энергетыка

ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЯ — ДЛЯ ДАМОЎ, ТОРФ — ДЛЯ ЦЭМЕНТУ

Будаўніцтва электражылля і яго перавод з цвёрдых відаў паліва на электраэнергію, выкарыстанне торфабрыкетаў, перспектывы стварэння майнінг–фермаў у Беларусі і будаўніцтва АЭС — гэтыя і іншыя пытанні закрануў міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ на сустрэчы з журналістамі перад выніковай калегіяй ведамства.

БОЛЬШ РЭСУРСАЎ

Арганізацыі галіны энергетыкі летась спрацавалі стабільна, а энергетычная інфраструктура актыўна мадэрнізавалася, паведаміў міністр. Сёлета збудавана 1900 км лініі электраперадачы, 183 км цепласетак, уведзена ў эксплуатацыю каля 1400 км газавых сетак, газіфікавана 32 тысячы кватэр.

Павышэнне энергетычнай самастойнасці краіны за кошт дыверсіфікацыі відаў і пастаўшчыкоў паліўна-энергетычных рэсурсаў (ПЭР), пашырэння выкарыстання мясцовых відаў паліва (МВП) і аднаўляльных крыніц энергіі, зніжэнне залежнасці ад вуглевадароднай сыравіны за кошт уводу БелАЭС — вось задачы энергетыкі на бягучую пяцігодку, акцэнтаваў увагу міністр:

— Такім чынам, першачарговая наша задача — забяспечыць увод у эксплуатацыю атамнай станцыі і яе далейшую інтэграцыю ў энергасістэму і эканоміку краіны. У дачыненні да энергасістэмы гэта будаўніцтва пікава-рэзервовых крыніц, агульная магутнасць якіх павінна скласці 800 МВт.

Што датычыцца МВП, то штогод у Беларусі здабываецца каля 2 млн тон торфу і вырабляецца 1,2 млн прадукцыі, 20 % якой экспартуецца, а 80 % — застаецца ў краіне. Выкарыстанне торфу дазваляе замяшчаць 450 млн м^3 прыроднага газу, а доля яго выкарыстання ў МВП — 15 %.

У будучым плануецца пашырэнне аб'ёмаў і асартыменту выпускаемай прадукцыі і развіццё асноўных напрамкаў выкарыстання торфу. Першы з іх — перавод кацельных ЖКГ з прыроднага газу на фрэзерны торф. Тры такія праекты ўжо рэалізуюцца ў Мінскай вобласці, а на пяцігодку прапрацоўваецца яшчэ прыкладна 80. Другі — выкарыстанне торфу для вырабу цэменту. За 2015—2019 гады для гэтага збудаваны дзве спецыяльныя лініі. Рэалізаваны праект па выкарыстанні тарфакрошкі на прадпрыемстве «Краснасельскбудаматэрыялы», растлумачыў кіраўнік Мінэнерга:

— Задача — за пяцігодку прыцягнуць у паліўны баланс краіны 3,3 млн тон умоўнага паліва ў выглядзе торфу. Па здабычы торфу Беларусь займае чацвёртае месца ў свеце, а па аб'ёмах вытворчасці паліўных брыкетаў — першае.

ЭЛЕКТРАЦЯПЛО Ў ШМАТПАВЯРХОВІКІ І ХАТЫ

Наступная пяцігодка стане часам павелічэння аб'ёмаў будаўніцтва і мадэрнізацыі падстанцый, высакавольтных і размеркавальных ліній электраперадачы з мэтай стварэння ўмоў для росту выкарыстання электраэнергіі ў эканоміцы і насельніцтвам, паабяцаў Віктар Каранкевіч.

У межах комплекснай галіновай праграмы па павелічэнні выкарыстання электраэнергіі на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне вызначаны тры асноўныя кірункі: будаўніцтва новага шматкватэрнага і індывідуальнага жылля з адпаведнай электрасеткавай інфраструктурай; перавод шматкватэрнага жылля, дзе для ацяплення выкарыстоўваецца цвёрдае паліва, на электраэнергію (85 такіх дамоў ужо ўключаны ў графік. Ён адкрыты, і калі жыхары гэтых дамоў захочуць перайсці на ацяпленне электраэнергіяй, яго павялічаць, — дадаў міністр); перавод індывідуальнага жылля на ацяпленне электраэнергіяй.

— Гэта работа вядзецца актыўна, для яе створаны адпаведныя ўмовы. Летась аб'ём спажывання энергіі на гэтыя мэты склаў больш як 89 млн кВт·г. Гэта ў сем разоў больш, чым у 2019-м, — падзяліўся Віктар Каранкевіч.

Ад грамадзян, якія жывуць ва ўласных дамах, летась паступіла каля 24 тысяч заяў на выдачу тэхнічных умоў атрымання і выкарыстання электраэнергіі на ацяпленне. 19,2 тысячы з іх задаволілі, а больш як восем тысяч беларусаў ужо карыстаецца гэтымі ўмовамі.

— Такія лічбы тлумачацца, у прыватнасці, стымулюючымі ўзроўнямі тарыфаў на выкарыстанне электраэнергіі на гэтыя мэты, што дзейнічаюць з пачатку 2019-га. А таксама Указ Прэзідэнта № 127, які дазваляе пакрываць людзям частку затрат на набыццё электрааацяпляльнага абсталявання і правядзенне работ па рэканструкцыі электрасеткавай праводкі», — мяркуе міністр.

1,5 МІЛЬЯРДА АТАМНЫХ КІЛАВАТ-ГАДЗІН

У межах чарговага этапу інтэграцыі БелАЭС у энергасістэму краіны, пабудаваны электракатлы на электрычных станцыях і буйных кацельных. 20 такіх аб'ектаў агульнай магутнасцю 916 МВт ужо актыўна выкарыстоўваліся ў сёлетнім ацяпляльным сезоне.

— Гэта асабліва актуальна ў перыяд вопытна-прамысловай эксплуатацыі на першым энергаблоку атамнай станцыі. Завяршыць гэты перыяд плануецца дынамічнымі выпрабаваннямі з наступным пераходам на комплекснае апрабаванне блока на працягу 15 сутак яго работы на поўнай намінальнай магутнасці. З моманту падключэння энергаблока да сеткі 3 лістапада ён выпрацаваў ужо каля 1,5 млрд кВт·г электраэнергіі, — расказаў міністр. — Будаўніча-мантажная гатоўнасць другога энергаблока — 78 %. Тут манціруюцца асноўныя тэхналагічнае абсталяванне і сістэмы, пракладваецца кабель, вядуцца работы па вертыкальнай планіроўцы і будаўніцтве дарог.

Што датычыцца перспектыў стварэння ў краіне фермаў па майнінгу крыптавалют, то гэты напрамак цікавы і новы для Беларусі, трэба дэталёва і комплексна вывучыць, у тым ліку і ў плане магчымых рызык, і гэтым ужо займаюцца, абазначыў Віктар Каранкевіч.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Добрыя навіны

ВЫПУШЧАНА ПРОБНАЯ ПАРТЫЯ ВАКЦЫНЫ «СПАДАРОЖНІК V»

Учора яе прадэманстравалі журналістам. Вакцыну вырабілі па расійскіх тэхналогіях на прадпрыемстве «Белмедпрэпараты».

Тэхналогія вытворчасці перададзена беларускаму фармпрадпрыемству кампаніяй АТ «Генерыум». Сёння на «Белмедпрэпаратах» разліваюць першыя так званыя валідацыйныя серыі (іх вырабілі тым жа спосабам, якім збіраюцца вырабляць прамысловую партыю). Пасля атрымання вынікаў стабільнасці першых серый будзе наладжана прамысловая вытворчасць вакцыны. Гэта задаволіць патрэбу Беларусі ў «Спадарожніку V».

— Сёння ў нас знакавы дзень — гэта афіцыйны старт арганізацыі вытворчасці вакцыны «Спадарожніку V» у Беларусі, — адзначыў **міністр аховы здароўя Беларусі Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — Наша ўзаемадзеянне з расійскім бокам носіць стратэгічны характар. Мы выканалі дамоўленасці кіраўнікоў нашых дзяржаў і першыя па-за межамі Расіі правялі клінічныя выпрабаванні, зарэгістравалі, пачалі вакцынацыю «Спадарожнікам V». Цяпер наша мэта — лакалізаваць вытворчасць на магутнасцях прадпрыемства «Белмедпрэпараты». У лютым мы правялі трансфер тэхналогій і пачынаем вясну з такой прыемнай навіны. Наша асноўная мэта — наладзіць вытворчасць на магутнасцях беларускага прадпрыемства, каб забяспечыць патрэбу нашай краіны.

Міністр нагадаў, што ў снежні, студзені і лютым Беларусь атрымлівала гатовую расійскую вакцыну, ёй жа краіна будзе карыстацца і ў сакавіку, пакуль першыя серыі ўласнай будуць пацверджаны на адпаведнасць арыгіналу.

Кірыл ДЗМІТРЫЕЎ, кіраўнік Расійскага фонду прамых інвестыцый, падкрэсліў, што Беларусь — стратэгічны партнёр Расіі ў справе вакцынацыі і адна з першых правяла тэхналагічны трансфер па вытворчасці прэпарату. Гэта адбылося дзякуючы развітой фармпрамысловасці нашай краіны, што дазволіла ў кароткія тэрміны асвоіць выпуск.

— Наш партнёр «Белмедпрэпараты» — прасунуты фармгулец, у тым ліку і ў параўнанні з многімі фармкампаніямі свету, якія з намі таксама супрацоўнічаюць. Мы бачым, што Беларусь можа не толькі вырабляць вакцыну для сябе, але пасля задавальнення ўнутранага попыту зможа экспартаваць яе ў трэція краіны, што дапаможа іншым дзяржавам у барацьбе з пандэміяй, — падзяліўся меркаваннем Кірыл Дзмітрыеў.

Генеральны дырэктар РУП «Белмедпрэпараты» Сяргей БЯЛЯЕЎ расказаў, што работа над арганізацыяй выпуску вакцыны была няпростай.

Фота БелТА

Вакцына «Спадарожнік V», распрацаваная расійскім Нацыянальным даследчым цэнтрам эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя ганаровага акадэміка М. Ф. Гамалеі, валодае эфектыўнасцю вышэй за 90 % і забяспечвае поўную засцярогу ад цяжкіх выпадкаў заражэння каранавірусам. Прэпаратам «Спадарожнік V» вакцынавана ўжо больш за 1,5 мільёна чалавек. Вакцына адобрана ў Расіі, Беларусі, Сербіі, Аргенціне, Балівіі, Алжыры, Палесціне, Венесуэле, Парагваі, Туркменістане, Венгрыі, ААЭ, Іране, Гвінеі, Тунісе і Арменіі.

Беларусь стала першай дзяржавай пасля Расіі, дзе афіцыйна зарэгістравалі «Спадарожнік V». Рэгістрацыйнае пасведчанне вакцыне было выдадзена 21 снежня 2020 года. У кастрычніку 2020 года ў Беларусі пачаліся першыя замежныя клінічныя даследаванні «Спадарожніка V». Першая партыя прэпарата «Спадарожнік V» у Беларусь была пастаўлена ў канцы снежня 2020 года.

— Сціснутыя тэрміны, анлайн-камунікацыя праз адсутнасць прамых выездаў за мяжу дадавалі складанасцяў. Але, як кажа кітайская прыказка, няма нічога немагчымага, на немагчымае патрэбна крыху больш часу. Мы наперадзе вялікага шляху: выраблены пробныя серыі, і мы павінны даказаць, што яны адпавядаюць патрэбным характарыстыкам.

Пасля Сяргей Бяляеў прадэманстраваў пробныя ўзоры.

Раней паведамлялася, што на магутнасцях беларускіх прадпрыемстваў плануецца вырабляць каля 500 тысяч доз вакцыны штомесяц.

Алена КРАВЕЦ.

Супрацоўніцтва

У ЭМІРАТАХ ВЕДАЮЦЬ НАШУ ЗГУШЧОНКУ

Экспазіцыя «Беларусь. Смак прыроды» на выстаўцы ў Дубаі дае свой першы плён.

Беларуская дэлегацыя працягвае работу на найбуйнейшай выстаўцы харчовай галіны Gulfood 2021 у сталіцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

На выстаўцы адбылася сустрэча **старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзіміра УЛАХОВІЧА з намеснікам Міністра прамысловасці і перадавых тэхналогій ААЭ Амарам АЛЬ-СУЭЙДЗІ.** Бакі абмеркавалі ўмацаванне сістэмы сертыфікацыі «Халяль» у Беларусі і правядзенне эмірацкім бокам навучальнага семінара па тэматыцы патрабаванняў, прад'яўленых да гэтай сістэмы.

Беларускую экспазіцыю таксама наведаў **дырэктар па міжнародных сувязях Гандлёва-прамысловай палаты Дубая Амар АЛЬ-ХАН,** які азнаёміўся са стэндамі беларускіх прадпрыемстваў, прадэгуставаў іх прадукцыю. Дасягнуты дамоўленасці аб далейшым узаемадзеянні паміж дзвюма палатамі па прадстаўленні інтарэсаў беларускіх вытворцаў у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах.

Поспехамі Беларусі на гэтай выстаўцы падзяліўся **дырэктар УП «Белінтэрэкспа» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Яўген УВЯДЗЕНСКІ:** «Днямі беларускую экспазіцыю наведаў Міністр кліматычных змен і навакольнага асяроддзя ААЭ Абдула Бельхайф Аль-Нуаймі. У кампетэнцыю гэтага міністэрства ўваходзяць ветэрынарны кантроль і допуск на рынак прадукцыі, якая ўвозіцца ў ААЭ. Падчас гэтага наведвання міністр сустрэўся з Паслом Рэспублікі Беларусь у ААЭ Андрэем Лучанком. Сярод іншага бакі абмеркавалі пытанне аператыўнага прыняцця рашэння аб допуску беларускага мяса птушкі на рынак ААЭ».

Па выніках чатырох дзён работы выстаўкі шэраг удзельнікаў ужо дасягнуў дамоўленасці на пастаўку прадукцыі не толькі ў ААЭ, але і ў Бангладэш, Гану, Егіпет, Іарданію, Іран, Ірак, Емен, Ліван, Лівію, Пакістан, Саудаўскую Аравію, Сербію, Сірыю. У прыватнасці, Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат заключыў першы кантракт на пастаўку 25 тон сметанковага масла 82,5 % тлустасці ў ААЭ. Кампанія вядомая на рынку — рагачоўскую згушчонку ўжо можна набыць у крамах ААЭ. Наступным прадуктам прадпрыемства на рынку Эміратаў стане канцэнтраванае малако.

Сяргей КУРКАЧ.

«У БЕЛАРУСІ БЕЗЛІЧ МЕСЦАЎ, ВАРТЫХ УВАГІ ТУРЫСТАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ірына Мікалаеўна, як горшы для сусветнага турызму год паўплываў на гэтую сферу ў Беларусі?

— Сапраўды, мінулы год быў выключны для турызму, і трэба было хутка адаптавацца да новых рэалій, вырашаць мноства праблем, з якімі дагэтуль не сутыкаліся. Спачатку ўсе спадзяваліся, што турыстычны паток ажыве летам 2020 года, але з цягам часу стала зразумела, што ў турыстычнай сферы адбылася катастрофа і сусветны турызм спыніўся. Разам з тым з'явілася магчымасць перагледзець пэўныя моманты, на якія раней не хапала часу. І мы зразумелі, што трэба больш увагі аддаваць унутранаму турызму, інфраструктуры для яго, створаны новыя цікавыя маршруты. Безумоўна, беларусы будуць ездзіць за мяжу, да мора і гор, якіх няма ў нашай краіне. Увогуле, людзям трэба знаёміцца з іншымі краінамі, бо, вярнуўшыся, яны пачынаюць больш цаніць і шанаваць унікальнасць сваёй. Незалежна ад таго, як будзе далей развівацца турызм, мы павінны зрабіць усё, каб людзям было камфортна і цікава ў Беларусі.

— Можна сказаць, што дзякуючы пандэміі ўнутраны турызм у Беларусі атрымаў другое жыццё?

— Я думаю, можна. Сёлета многія інакш паглядзелі на сваю краіну. Відавочны факт, і адчуваю гэта на сабе, што беларусы не ведаюць Беларусі. Многія па дзесяць разоў зляталі за мяжу, але ніколі не былі ў суседняй вобласці. Гэта няправільна, таму што атаясамліваць сябе з краінай, яе грамадствам можна толькі ведаючы і адчуваючы культуру і гісторыю краіны. У нас ёсць мясціны, якія людзі актыўна наведваюць. А яшчэ больш мясцін, якія трэба раскрыць і якія ў будучым стануць папулярныя. Тыя ж Альманскія балоты — першародная прырода... Можа, у нас не захавалася такой колькасці палацаў, як у Германіі, ці кафедральных сабораў, як у Італіі, але нам ёсць чым ганарыцца і што паказаць. Напрыклад, аграсядзібы, якія стараюцца паказаць векавую беларускую культуру, рамёствы, традыцыі.

Важная задача сёння — удасканаліць інфраструктуру на турыстычных лакацыях, прапанаваць людзям сэрвіс высокага ўзроўню. Аб'ект становіцца папулярны, калі турысту там камфортна. Таму 2020 год, нягледзячы на яго трагічнасць, даў магчымасць зрабіць работу над памылкамі і заняцца пытаннямі, на якія не хапала часу. У гэты год скончыўся адзін этап і пачалася падрыхтоўка да новага.

— Што маеце на ўвазе?

— У 2020 годзе мы аднавілі асноўныя дакументы ў турыстычнай галіне. Нам патрэбна было скласці стратэгію развіцця да 2035 года. Была праведзена вялікая работа, пасля калапсу, які адбыўся ў свеце, ніхто не разумеў, як можна штосьці прагназаваць. Нават Сусветная турысцкая арганізацыя не дае ніякіх прагнозаў, а толькі кажа, што турызм вернецца да паказчыкаў 2019 года праз 2-4 гады. У 2020 годзе заканчвалася дзяржаўная праграма на пяцігодку і трэба было ствараць новую з улікам актуальных праблем. Быў неабходны новы план мерапрыемстваў па аднаўленні турызму. Заканчвалася дзеянне ўказа Прэзідэнта аб развіцці аграэкатурызму, і мы працавалі над яго працягам, 4 лютага ён быў падпісаны яшчэ на пяць гадоў.

«З цягам часу стала зразумела, што ў турыстычнай сферы адбылася катастрофа і сусветны турызм спыніўся».

Не спыняецца работа над законам аб турызме, і там закранаюцца праблемы, якія ў сакавіку мінулага года былі самыя актуальныя — забеспячэнне адказнасці турааператараў і турагентаў перад турыстамі. Калі пачалі закрывацца межы і людзі заставаліся ў чужых краінах без магчымасці вярнуцца дадому, наша каманда літаральна жыла на рабоце. Праз розніцу ў часе мы працавалі і днём, і ноччу. Гэты вопыт паказаў, што такія пытанні павінны быць прадугледжаны ў заканадаўстве, каб беларускія турысты былі абаронены.

— Згодна з дзяржаўнай праграмай «Беларусь гасцінная», у прыярытэце — прасоўванне нацыянальных турысцкіх брэндаў. Усім вядомыя нашы Белавежская пушча, палацы ў Нясвіжы і Міры. Якія новыя, пакуль малавядомыя, мясціны могуць стаць турысцкімі брэндамі?

— У нас ёсць чатыры аб'екты са спіса сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Палацы ў Нясвіжы і Міры, Белавежская пушча на слыху. А ёсць дуга Струвэ, пра якую беларусы калі і ведаюць, то мала хто можа растлумачыць, што гэта такое. Гэта еўрапейцы едуць на яе паглядзець... У Беларусі безліч мясцін, вартых увагі турыстаў. Напрыклад, Косаўскі палац, касцёл у Гервятах і мноства іншых. Своеасаблівым брэндам можна лічыць аграэкатурызм, і ў цэлым экалагічны турызм можа заняць вядучую ролю.

— Некалькі гадоў таму актыўна абмяркоўвалася стварэнне брэнда Беларусі, але гэта пытанне так і не было вырашана. Наколькі краіне неабходны турыстычны брэнд і якая работа праводзіцца ў гэтым кірунку?

— Я магу ўпэўнена сказаць, што ў краіны павінен быць свой турыстычны брэнд, ён дазваляе запомніць краіну і ўсюды яе пазнаваць. Мне вельмі падабаецца прыклад Славеніі. У англійскім варыянце назвы краіны Slovenia ёсць слова «love». І яны вельмі добра абыгралі і вылучылі, што гэта адзіная краіна, у назве якой ёсць слова «любоў». Славенія — краіна, дзе шмат зеляніны, вады, гэтае багацце таксама падкрэсліваецца. І ўжо краіна асацыюецца з брэндам.

Калі пачалася работа над брэндам Беларусі, мяне яшчэ не было на пасадзе дырэктара дэпартамента па турызме. А ў 2020 годзе не хапіла часу. Сёння мы працягваем работу над брэндам, супрацоўнічаем з рознымі міжведамаснымі органамі. Брэнд датычыцца не толькі турызму, ён уключае шматлікія аспекты, якія раскрываюць і паказваюць краіну.

У Беларусі ўжо ёсць месцы, якія маюць свой брэнд. Напрыклад, «Славянскі базар» атаясамліваецца з васільком. На маю думку, брэнд павінен быць у кожнага рэгіёна, бо яны ж розныя. Беларусь неаднародная, і брэнд павінен гэта адлюстроўваць. Мы працуем у згаданым кірунку, і зусім хутка гэта пытанне будзе ўзнята зноў.

«Вельмі спадзяюся, што іншыя гарады возьмуць прыклад з Гродна. У нашых рэгіёнаў павінна быць спаборніцтва паміж сабой — хто зацікавіць больш турыстаў».

— У 2020 годзе стварылі і аднавілі 14 турысцкіх напрамкаў, якія з іх самыя папулярныя?

— Наш дэпартамент як рэгулятар і Нацыянальнае агенцтва па турызме распрацавалі маршруты, якія ахопліваюць усе рэгіёны. У кожным праходзяць адукацыйныя семінары для прадстаўнікоў галіны, дзе разглядаюцца асаблівасці рэгіёна і адпаведны від турызму. Жыровічы дапамагаюць развіваць рэлігійны турызм, на Валожыншчыне ў Мінскай вобласці працуе кластар аграсядзіб. У Налібоцкай пушчы ёсць экалагічная сцежка, якой няма аналагаў. У кожнага рэгіёна ёсць свая адметнасць, якую трэба калі не зрабіць брэндам, то хоць бы добра рэкламаваць, каб як мага больш людзей цікавілася і ездзіла.

Беларусь славіцца медыцынскім турызмам, усе любяць нашы санаторыі. Ва ўмовах пандэміі каранавіруса гэта стала асабліва важна.

У 2020 годзе нашы санаторыі наведала шмат людзей. Туды едуць не толькі, калі ёсць праблемы са здароўем, як гэта было раней, а каб адпачыць, перазагрузіцца. Санаторыі распрацавалі спецыяльныя праграмы па аднаўленні здароўя пасля каранавіруса.

Многія любяць актыўны адпачынак — сплавы на байдарках, катанне на конях, што прапаноўваюць аграсядзібы. Развіваецца вытворчы турызм. Кожнаму будзе цікава на свае вочы ўбачыць, як працуе «Камунарка» ці БелАЗ.

— На сайце Нацыянальнага агенцтва па турызме прадстаўлены і яго незвычайныя віды. Асабліва цікавыя «чорны» — падарожжы па мясцінах з містычнай славай і «джайлоа-турызм» — мікс экалагічнага і экстрэмальнага. Як яны развіваюцца ў Беларусі?

— Напрыклад, наведванне Альманскіх балот — гэта экалагічны турызм. А прагулка па іх на балотаступах — гэта ўжо экстрым. Страх праваліцца ў багну ёсць у многіх. Для кагосьці экстрым — сплаў на байдарках. Вось і джайлоа-турызм. Запазычванне назваў з замежных моў добра прыцягвае ўвагу людзей.

Мы са школы ведам, што ў старажытных замках ёсць прывіды — «чорны», містычны турызм. Гэтыя незвычайныя віды развіваюцца дзякуючы экскурсаводам, якія ствараюць такія маршруты. Штогод праводзіцца фэст экскурсаводаў, падчас якога спецыялісты праяўляюць сябе, хто на што здольны. Адсюль і містычныя, і веласіпедныя, і бегавыя, і многія іншыя незвычайныя экскурсіі. І выдатна, што людзі цікавяцца такімі фарматамі, у кожнага ёсць свае аматары. Хачу яшчэ адзначыць, што фэст экскурсаводаў праводзіцца ў многіх краінах, дзе ёсць беларускія дыяспары.

— Як развіваць экалагічны від турызму, каб паказаць людзям усё багацце беларускай прыроды і пры гэтым захаваць належны стан навакольнага асяроддзя?

— У Беларусі добра развіты кемпінгавы напрамак і ёсць спецыяльна абсталяваныя пляцоўкі з душамі, туалетамі, неабходнымі ўмовамі. Напрыклад, кемпінг на возеры Сялява ў Мінскай вобласці адпавядае ўсім міжнародным стандартам.

Усё гэта робіцца, каб людзям было камфортна. Але шмат увагі аддаецца адпаведнасці еўрапейскім і нацыянальным экалагічным стандартам.

Калі ўлічваць усе патрабаванні, можна стварыць умовы, каб людзі праводзілі шмат часу на прыродзе і пры гэтым не чынілі ёй шкоды.

— У Гродне запусцілі мабільны гід Grodno guide, стварылі буклет «Пашпарт турыста», дзе сабрана неабходная для гасцей інфармацыя. На вашу думку, іншыя гарады падтрымаюць гэтую ініцыятыву?

— Я вельмі спадзяюся... У нашых рэгіёнаў павінна быць спаборніцтва паміж сабой — хто прывабіць больш гасцей. Канешне, для сучаснага турыста мабільны гід больш зручны і карысны, чым друкаваная карта. Гродна паказаў выдатны прыклад па стварэнні ўмоў для прыезджых.

«Можа, у нас не захавалася такой колькасці палацаў, як у Германіі, ці кафедральных сабораў, як у Італіі, але нам ёсць чым ганарыцца і што паказаць».

— Ірына Мікалаеўна, вы адзначалі, што ў кожным рэгіёне павінен быць турысцкі інфармацыйны цэнтр. Як вырашаецца гэтае пытанне?

— Нядаўна мы ўзгаднілі з урадам краіны павелічэнне штату Нацыянальнага агенцтва па турызме. У сувязі з гэтым у найбліжэйшы час у кожным рэгіёне з'явіцца па тры спецыялісты. Сёння ў рэгіёнах няма людзей, якія займаюцца турызмам. І гэта вялікая праблема, аб якім развіцці можна казаць, калі няма адказных за гэта людзей? Таму пакуль мы пачынаем з трох спецыялістаў, і ў будучым у кожным рэгіёне будзе адкрыты свой інфармацыйны турыстычны цэнтр.

Арганізаваных турыстычных груп становіцца менш, людзям больш зручна і бяспечна ездзіць кампаніяй сяброў на сваім транспарце. Наша задача даць турыстам магчымасць лёгка і хутка атрымаць інфармацыю аб месцы, куды яны прыехалі.

— Якія беларускія лакацыі сталі самымі папулярнымі ў 2020 годзе?

— У кожным рэгіёне ёсць месцы, якія прымаюць турыстаў. Магчыма, варта зрабіць аналіз. Але ўнутраныя перамяшчэнні неарганізаваных груп вельмі цяжка, амаль немагчыма адсочваць.

Нягледзячы на папулярнасць Белавежскай пушчы, Міра, Нясвіжа, Аўгустоўскага канала, летам 2020 года іх наведала рэкордная колькасць турыстаў. Але гэта не значыць, што іншыя мясціны былі менш папулярныя.

— Як тры гады пад знакам малой радзімы паўплывалі на развіццё ўнутранага турызму?

— Праз пандэмію ўнутраны турызм стаў хіба што не асноўнай часткай трылогіі малой радзімы. Тыя, хто раней у адпачынак выязджаў за мяжу, сёлета паехалі на сваю Бацькаўшчыну.

Мы праводзілі конкурс «Пазнай Беларусь» і атрымалі рэкордную колькасць работ, прысвечаных малой радзіме. Гэта сведчыць аб тым, што людзі актыўна ездзілі туды, дзе нарадзіліся.

Валерыя СЦЯЦКО.

Чужыя блізкія

АНЁЛ ПА ІМЕНІ АЛЕНА

ЯК ПРАДПРЫМАЛЬНІЦА СТАЛА САЦРАБОТНІКАМ

...Алена ляжала ў бальніцы ўжо некалькі дзён, калі да іх у палату падсялілі пажылую жанчыну. Яе прывезла на лячэнне сацыяльны работнік і потым ні разу не патэлефанавала, не даведалася, як справы ў падапечнай.
Алена і раней час ад часу чытала паведамленні аб нядобрасумленных сацработніках, а гэты выпадак быў доказам іх «нядобрасці». Тады яна і ўявіць не магла, што дапамога пажылым людзям стане яе прызваннем...

Сацыяльны работнік тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска Алена СЦЕПАНЕНКА працуе на сваім месцы каля двух гадоў. За гэты час ёй давялося «пазнаёміцца» з беларусамі як з людзьмі, гатовымі прыйсці на дапамогу, ахвяруючы сваім часам і рэсурсамі. І разам з тым яна сутыкнулася са светам пажылых людзей, з іх адзінотай і безабароннасцю.

Сустрэла мяне сацработнік дома ў сваёй падапечнай Рэгіны Іосіфаўны, якой нядаўна споўніўся 91 год. На жаль, жанчына пасля бальніцы ўжо не можа хадзіць, але, убачыўшы госцю, адразу пачала дзяліцца гісторыямі са свайго жыцця.

— Мне было каля дванаццаці гадоў, калі я стала дапамагаць партызанам, — расказвала бабуля. — У мяне нават быў свой конь! Неяк ён мяне скінуў, раздрабілася калена. З таго часу кульгаю, але гэта не перашкаджала мне ў жыцці танцаваць, пець, вучыцца і працаваць.

Алена Адамаўна ўсміхаецца і садзіцца на край ложка да Рэгіны Іосіфаўны. Па яе выглядзе зразумела: ёй прыемна ад таго, што яе падапечная з такім запалам расказвае пра сваё жыццё. Яна ціхенька папраўляе бабулі коўдру.

— Ведаеце, я сама вывучылася іграць на акардэоне і потым ездзіла па дзіцячых лагерах паказваць сваё майстэрства, — успамінае Рэгіна Іосіфаўна. — Скончыла медуніверсітэт, у Маскоўскай аспірантуры абараніла доктарскую дысертацыю. Працавала ў інстытуце, у Міністэрстве аховы здароўя, у бальніцы... Выйшла замуж, але муж рана памёр, прыйшлося самой выхоўваць сына. Добры чалавек вырас. Вывучыўся, працаваў на «Інтэграле», потым з'ехаў за мяжу, але ж размаўляем па «Скайпе» кожны тыдзень... Зараз мне ўжо і памерці хочацца, але ніяк не атрымліваецца. Пляменніца сышла праз гэты вірус, а я ўсё жыву.

— Не-не,— умешваецца ў размову Алена. — Мы яшчэ ваша стагоддзе адсвяткуем!

Рэгіна Іосіфаўна, падобна, не супраць, яна зноў захацела жыць і расказваць пра газеты, якія чытае, пра любімыя фільмы і тэлеканал «Культура»...

Алена не вучылася ні на медработніка, ні на псіхолага, яна не праходзіла адмысловыя курсы. Але ў яе цудоўна атрымлівалася адцягнуць увагу пажылога чалавека ад цяжкіх думак. Усё жыццё Алена Сцепаненка была прадпрымальнікам. Яна працавала на рынку і мела свае невялікія крамы. Як і многія прадстаўнікі бізнесу, дапамагала шматдзетным, ахвяравала інвалідам і сіротам, але ніколі падумаць не магла, што стане ўдзельнікам жыцця адзінокіх людзей. Калі зразумела, што быць прадпрымальнікам больш не можа, да пенсіі заставалася амаль два з паловай гады, і Алена вырашыла шукаць работу, звязаную з дапамогай людзям. Проста хацелася рабіць нешта патрэбнае. Жанчына добра памятала, як даглядаць пажылых людзей, бо некалі дапамагала бабулі, а потым даглядала маці. У выніку вырашыла пайсці працаваць у ТЦСАН сацыяльным работнікам.

— Калі пазнаёмілася з новымі калегамі, зразумела, што гэта людзі з вялікім сэрцам, — гаворыць Алена Адамаўна. — Заробак за такую цяжкую працу вельмі невялікі — каля 650 рублёў. Таму застаюцца толькі тыя, для каго гэта не проста работа, а лад жыцця. Сёння ў ТЦСАН Маскоўскага раёна знаходзіцца 345 чалавек, з іх 180 — гэта адзінокія пажылыя людзі, якім дапамагаюць 38 сацыяльных работнікаў і 22 сядзелкі. Падчас пандэміі яны падтрымліваюць не толькі сваіх падапечных. Пажылыя людзі з усяго раёна звяртаюцца на «гарачую» лінію цэнтра з просьбамі. Было, у пачатку пандэміі ў дзень паступала па 10 заявак, «валанцёрыла» нават начальства. Але і тады сваіх людзей не хапала, на дапамогу прыходзілі валанцёры Чырвонага Крыжа і БРСМ. (Падчас пандэміі супрацоўнікі цэнтра выканалі 1197 заявак.)

— Пандэмія, асабліва першыя месяцы, была вельмі «гарачым часам», — успамінае Алена Адамаўна. — Прыбіраеш у падапечнай, а табе тэлефануюць, што недалёка ад дома, дзе ты знаходзішся, пажылы чалавек мае патрэбу ў леках... Так вось і бегала па людзях з сумкамі. Увечары проста валілася з ног. Цяпер ужо менш тэлефануюць, прыходзіць па 2-3 заяўкі ў дзень, таму спраўляемся самі, без валанцёраў.

У ТЦСАН можна звярнуцца па паслугі сядзелкі, як і зрабіла Рэгіна Іосіфаўна. Алена — сацыяльны работнік і прыходзіць да жанчыны дапамагць два разы на тыдзень. У яе абавязкі ўваходзіць прыбрацца, прыгатаваць ежу, памыць чалавека, схадзіць па прадукты, лякарствы, па рэцэпты ў паліклініку і нават вывесці пажылога чалавека на прагулку. Алена не знаходзіцца цэлы дзень у бабулі, бо ў яе, акрамя Рэгіны Іосіфаўны, яшчэ 10 падапечных. Але да жанчыны кожны дзень прыходзіць сядзелка з цэнтра. Сёння дапамога сядзелкі каштуе 2,76 рубля за гадзіну і, як прызналася Рэгіна Іосіфаўна, — гэта вельмі добрая цана. Яна раней спрабавала знайсці памочніцу не праз цэнтр, што аказалася вельмі дорага: самая «танная» запрасіла за выхадныя ажно 80 рублёў. Для пажылога чалавека, які жыве на пенсію, такая сума проста непад'ёмная.

— Гэта добра, што пра ТЦСАН і па тэлевізары гавораць, і ў газетах пішуць, і ў паліклініцы нагадваюць, — разважае бабуля. — Нам, пажылым людзям, без гэтай службы не выжыць. Лічу, што ў маім жыцці з'явіўся анёл Алена. Яна ведае, як падняць мне настрой, якую кашу мне прыгатаваць, які ёгурт я люблю і які сыр мне набыць у краме. Яна стала часткай майго жыцця.

Алена ківае ў знак згоды. На кухні жанчына прызнаецца, што яе жыццё і сапраўды цесна пераплялося з жыццём падапечных.

— Прыходжу вось да аднаго ў чацвер... Набыла прадукты, потым разам прыбраліся, паелі... Мужчына быў задаволены і вясёлы. У нядзелю тэлефаную спытаць, што на заўтра купіць, а ён трубку не бярэ. Яшчэ раз набіраю, ужо з трывогай: ён жа, думаю, заўсёды ведаў, калі я буду тэлефанаваць... Высветлілася, памёр у суботу. Ставіў чайнік, каб чаю папіць, упаў ля пліты і памёр. Няма чалавека. Ён шмат мне расказваў пра сваё жыццё: нібыта пражыла з ім яго дзяцінства, маладосць, сталасць... Ведала, што любіць, як складвае рэчы... Рада, што ведала яго, што некаторы час была яму апорай.

Жанчына прызнаецца: яна вельмі занепакоена тым, што яе падапечныя не маюць жадання жыць. Яны звыкаюцца са сваёй адзінотай і ўжо не бачаць сэнсу ў самім жыцці.

— Па кроплях раблю іх дні лягчэйшымі, — дадае Алена. — Кожны мой падапечны, чалавек са сваёй гісторыяй, становіцца для мяне блізкі. За два гады работы я так і не сустрэла ў гэтай сферы раўнадушша. Дакладна ведаю, што застануся працаваць у цэнтры і пасля выхаду на пенсію. Гэта магчымасць рабіць нешта важнае ў жыцці і заставацца патрэбнай.

Жанчына глядзіць на гадзіннік. Пара. Яшчэ трэба зайсці ў паліклініку і ўзяць даведку для Сяргея Данілавіча. Алена Адамаўна спяшаецца да пажылога чалавека, каб зрабіць яго дзень трошкі лепшым.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

• Даведка

✓ У краіне сацыяльныя паслугі аказваюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у якіх працуе 20 тысяч чалавек, з іх 11,5 тысячы — сацыяльныя работнікі.

✓ На сістэмнай аснове комплексныя сацыяльныя паслугі дома атрымліваюць 97 тысяч непрацаздольных грамадзян. У асноўным гэта людзі, старэйшыя за 75 гадоў. Сацыяльныя работнікі наведваюць пажылых грамадзян два-чатыры разы на тыдзень у залежнасці ад патрэбы.

✓ Усяго за час правядзення кампаніі па падтрымцы пажылых грамадзян і інвалідаў у перыяд складанай эпідэмічнай абстаноўкі тэрытарыяльнымі цэнтрамі выканана амаль 45 тысяч заявак. Заяўкі на дастаўку прадуктаў, прадметаў першай неабходнасці і медыкаментаў прымаюцца па рабочых днях ад 8 да 17 гадзін.

Сацыяльная абарона

З клопатам аб тых, хто мае патрэбу

У тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Баранавіцкага раёна адкрылі новае аддзяленне дзённага знаходжання для людзей з інваліднасцю.

Раней было створана аддзяленне дзённага знаходжання для людзей з інваліднасцю і пажылых грамадзян у аграгарадку Жамчужны. Крыху пазней было прынята рашэнне аб стварэнні другога аддзялення ў Баранавічах, на тэрыторыі адміністрацыйнага будынка ТЦСАН. Былі адрамантаваны памяшканні і закуплена абсталяванне. У новае аддзяленне ўжо залічаны 25 чалавек.

Напрыклад, у кабінеце гурткавай работы наведвальнікі могуць займацца творчасцю і навучацца камп'ютарным азам. Па суседстве абсталяваны пакой сацыяльна-бытавой адаптацыі. Там ёсць кухонная мэбля, электраплітa, халадзільнік, пральная машына, мікрахвалевая печ і электрачайнік. У такой абстаноўцы спецыялісты дапамагаюць у навучанні інвалідам, каб тыя маглі самастойна абслугоўваць сябе. Трэці кабінет прызначаны для фізічнай рэабілітацыі. Там устаноўлены механічная бегавая дарожка, вела- і іншыя трэнажоры. Дадаткова набыты спартыўны інвентар: мячы, гімнастычныя палкі і палкі для скандынаўскай хады, дартс, гантэлі, шашкі, шахматы. Для зняцця напружання і расслаблення добраўпарадкаваны сэнсарны пакой з бескаркаснай мэбляй, пузырковай панэллю, сталом для пескаграфіі.

Таксама ў ТЦСАН Баранавіцкага раёна ёсць планы па адкрыцці яшчэ аднаго аддзялення — кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей і інвалідаў. Яно размесціцца ў аднапавярховым будынку былога дзіцячага сада — школы ў вёсцы Прыазёрная. Сёлета выдзелены грошы на праектна-каштарысную дакументацыю. Пры наяўнасці фінансавання аддзяленне будзе адкрыта ў 2022—2023 гадах.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Авторалли призов»

1. Наименование рекламной игры.

Настоящая рекламная игра называется «Авторалли призов» (далее – Рекламная игра, Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила), согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

2. Сведения об Организаторе.

2.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», УНП 190771520, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 2 ноября 2006 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190771520.

2.2. Юридический адрес и местонахождение Организатора: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18б, 7-й этаж, к. 25, пом. 701.

2.3. Заинтересованным лицом Рекламной игры является открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

3. Территория проведения Игры.

Игра проводится на территории Республики Беларусь.

4. Период проведения Игры.

Игра проводится в период с 01.03.2021 по 31.07.2021, включая период розыгрышей и вручения призов.

5. Комиссия по проведению Игры.

5.1. Для контроля за ходом игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры.

Члены комиссии:

1. Тимошенко Сергей Александрович – начальник Управления продаж Департамента развития розничных продуктов и цифровизации ОАО «Белагропромбанк»;

2. Карпицкий Юрий Сергеевич – начальник Управления маркетинга и общественных связей ОАО «Белагропромбанк»;

3. Гапеева Вероника Сергеевна – индивидуальный предприниматель;

4. Атрашкевич Екатерина Владимировна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ»;

5. Шорр Полина Андреевна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ».

5.2. Комиссия осуществляет контроль за соблюдением установленных Правил проведения Игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны участников Игры.

5.3. Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение срока проведения Игры.

6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.

Игра проводится в целях стимулирования заключения новых договоров срочного безотзывного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» (белорусские рубли, доллары США, евро, российские рубли).

7. Участники Игры.

7.1. Участниками Игры могут быть:

- граждане Республики Беларусь;
- иностранные граждане;
- лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;
- лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь.

7.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии.

8. Состав и размер призового фонда.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица.

Призовой фонд включает в себя 30 Поощрительных призов и 9 Автомобилей, указанных в Таблице № 1. Общий размер призового фонда составляет **532 758,75 (Пятьсот тридцать две тысячи семьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей 75 копеек**.

Таблица № 1.

№ п/п	Наименование призов, участвующих в розыгрыше	Далее в правилах	Кол-во, шт.	Стоимость за 1 ед., белорусских рублей	Всего стоимость, белорусских рублей
1	Денежный приз на сумму 3 000,00 белорусских рублей (Три тысячи белорусских рублей 00 копеек)	Поощрительный приз	30	3 000,00	103 448,40
	Денежные средства в размере			448,28	
2	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z5LB402549	Автомобиль 1	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
3	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z3LB402548	Автомобиль 2	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
4	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752ZXLB402403	Автомобиль 3	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
5	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z9LB402392	Автомобиль 4	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
6	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z2LB402413	Автомобиль 5	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
7	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z0LB402412	Автомобиль 6	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
8	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z1LB402399	Автомобиль 7	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
9	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z7LB402407	Автомобиль 8	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
10	Автомобиль Geely Emgrand X7 (NL4), хэтчбэк, Luxury(GL) (2.0), бензин, АКПП6, 2WD, Y4K8752Z4LB402400	Автомобиль 9	1	41 500,00	47 701,15
	Денежные средства в размере			6 201,15	
ИТОГО					**532 758,75**

Условия участия в Игре.

9.1. Для участия в Игре физическому лицу необходимо:

9.1.1. В период с 01.03.2021 по 31.05.2021 включительно заключить договор срочного безотзывного банковского вклада (депозита) (далее – Договор) в ОАО «Белагропромбанк» сроком хранения от 185 (ста восьмидесяти пяти) дней и более, на сумму не менее, чем:

- 10 000,00 (Десять тысяч) белорусских рублей;
- или 3 500,00 (Три тысячи пятьсот) долларов США;
- или 2 500,00 (Две тысячи пятьсот) евро;
- или 150 000,00 (Сто пятьдесят тысяч) российских рублей.

9.1.2. В периоды, указанные в Таблице № 2, оставаться действующим вкладчиком Договоров, заключенных согласно п. 9.1.1 настоящих Правил.

9.1.3. Согласие на участие в Рекламной игре, а также на предоставление ОАО «Белагропромбанк» Организатору своих персональных данных и информации, составляющей банковскую тайну, подтверждается Участником при заключении Договора.

9.2. При наличии у одного Участника более одного Договора, соответствующего условиям Игры, каждый из этих Договоров принимает участие в розыгрыше, согласно п.10.6 настоящих Правил.

9.3. В случае досрочного расторжения Договора, в соответствии с условиями, установленными ОАО «Белагропромбанк», Участник теряет право на участие в Игре.

10. Порядок проведения Розыгрышей призового фонда.

10.1. Место и даты проведения розыгрышей – г. Минск, ул. Шаранговича, д. 4 (здание ОАО «Белагропромбанк»): 07.04.2021, 12.05.2021, 09.06.2021.

10.2. Розыгрыши призового фонда проводятся открыто с возможностью присутствия на них Участников Игры. Результаты розыгрышей Игры не зависят от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

10.3. В розыгрышах призового фонда принимают участие все Участники Игры, выполнившие п. 9.1 настоящих Правил.

10.4. Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в Таблице № 2 настоящих Правил.

10.5. Для проведения каждого розыгрыша призового фонда формируется список (далее – Список) из Участников Игры, выполнивших условия настоящих Правил, в которых присваиваются Номера Участников по дате и времени заключения Договоров и номерам Договоров по возрастанию. Номер Участника присваивается в порядке возрастания даты и времени заключения Договора и номера Договора в Списке, при этом по каждому Договору присваивается номер Участника за каждую часть суммы Договора, равную или превышающую сумме(му), указанной(ную) в п. 9.1.1 настоящих Правил.

Например, Участнику, заключившему Договор в ОАО «Белагропромбанк» сроком хранения от 185 (ста восьмидесяти пяти) дней и более, на сумму 20 000,00 (Двадцать тысяч) белорусских рублей или 7000,00 (Семь тысяч) долларов США, присваивается 2 (два) Номера Участника.

В Списке по каждому Участнику указывается: присвоенный(ные) Номер(ра) Участника, ФИО Участника, номер Договора, дата заключения Договора, время заключения Договора. Все Номера Участника имеют одинаковое количество разрядов.

10.6. Розыгрыши Призов проводятся согласно следующему графику:

Таблица № 2.

№ розыгрыша	Дата и время розыгрыша	Периоды участия, в которых были заключены участвующие в розыгрыше Договора	Договора являются действующими:	Призы
1	07.04.2021 в 21:00	с 01.03.2021 по 31.03.2021 включительно	по состоянию на 01.04.2021	Поощрительный приз – 10 шт. Автомобиль 1 – 1 шт. Автомобиль 2 – 1 шт. Автомобиль 3 – 1 шт.
2	12.05.2021 в 21:00	с 01.03.2021 по 30.04.2021 включительно	по состоянию на 01.05.2021	Поощрительный приз – 10 шт. Автомобиль 4 – 1 шт. Автомобиль 5 – 1 шт. Автомобиль 6 – 1 шт.
3	09.06.2021 в 21:00	с 01.03.2021 по 31.05.2021 включительно	по состоянию на 01.06.2021	Поощрительный приз – 10 шт. Автомобиль 7 – 1 шт. Автомобиль 8 – 1 шт. Автомобиль 9 – 1 шт.

10.7. Для определения выигрышного Номера Участника Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти).

10.8. Определение выигрышного Номера Участника происходит путем его формирования слева направо из цифр на шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

10.8.1. Первый разряд Номера Участника определяется следующим путем: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 по цифру, соответствующую первому разряду последнего зарегистрированного Номера Участника. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Номера Участника. Номер шара вносится в протокол.

Далее в следующий сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному Списку Номеров Участника в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Номера Участника. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

10.8.2. Участник может стать Победителем приза «Автомобиль» только один раз в течение всего периода Игры. В случае если Номер Участника, принадлежащий Участнику, уже выигравшему приз «Автомобиль» в Рекламной игре, выигрывает приз «Автомобиль», выигрышным признается следующий по Списку Номер Участника другого Участника.

10.9. При проведении каждого розыгрыша Организатор дополнительно определяет по 1 (одному) резервному Победителю для каждого приза «Автомобиль» и по 1 (одному) резервному Победителю для каждого Поощрительного приза. Резервными Победителями становятся следующие за выигрышными Номера Участников других Участников. Всего 39 (тридцать девять) резервных Победителей.

10.10. Результат каждого Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии.

11. Порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша.

11.1. Организатор уведомляет Победителей о выигрыше по телефону в течение двух рабочих дней после розыгрыша, а также дополнительно может известить Победителей письмом по почте не позднее 30.06.2021.

11.2. Для получения Поощрительного приза Победитель должен предоставить информацию Организатору по 08.07.2021 включительно любым из указанных способов:

1) письмом по почте по адресу: ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18б, 7-й этаж, к. 25, пом. 701;

2) письмом на электронный почтовый ящик Организатора: igra@tdi.by;

3) лично по адресу Организатора: ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18б, 7-й этаж, к. 25, пом. 701 в рабочие дни с 10.00 до 17.00,

а именно:

а) копию страницы 25, а также страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

б) копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

в) заявление/выписку об открытии карточного счета в ОАО «Белагропромбанк», на который будет перечисляться сумма приза.

Суммы Поощрительных призов (за вычетом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза) передаются Победителям путем зачисления на карточные счета Победителей ОАО «Белагропромбанк» не позднее 09.07.2021.

С общими условиями банковского обслуживания физических лиц в ОАО «Белагропромбанк», а также с информацией о банковских картах можно ознакомиться на Интернет-сайте www.belapb.by.

11.2.1. Для получения приза «Автомобиль» Победитель либо его представитель должен прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 7 этаж не позднее 09.07.2021, предварительно согласовав с Организатором дату и время прибытия по телефону +375 44 555 11 66. При себе Победителю необходимо иметь документ, удостоверяющий личность, для предъявления Организатору и использования данных при оформлении необходимых документов в рамках Рекламной игры. Копии данного документа Организатор оставляет у себя.

11.3. Приз не вручается основному Победителю, а вручается резервному Победителю в случае, если основной Победитель:

11.3.1 отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

11.3.2. нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставляет необходимые документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами (п. 11.2);

11.3.3. не выходит на связь с Организатором и не является для получения приза «Автомобиль» в сроки, установленные Правилами (п. 11.2.1).

11.4. Резервные Победители, которым перешло право на получение приза, уведомляются об этом не позднее 14.07.2021, по номерам телефонов Участников.

Резервные Победители Поощрительных призов должны выполнить действия, перечисленные в пункте 11.2 Правил не позднее 28.07.2021. Поощрительные призы будут зачислены резервным Победителям на карточные счета ОАО «Белагропромбанк» по 31.07.2021 включительно.

Резервные Победители приза «Автомобиль» должны выполнить действия, перечисленные в пункте 11.2.1 Правил не позднее 31.07.2021. Призы «Автомобиль» будут выданы резервным Победителям по 31.07.2021 включительно.

В случае если резервный Победитель не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение приза. Призы остаются в распоряжении Организатора.

11.5. Выдача призов представителям Победителей осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности.

11.6. Призы не подлежат замене. Денежный эквивалент призов «Автомобиль» Победителям не выплачивается. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

11.7. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении призов выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза. Выдача призов Победителям осуществляется за вычетом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Победителя, по причине отсутствия ему денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Победителя, Организатор обязан направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу с Победителя.

12. Права и обязанности участников Игры.

12.1. Принимая участие в Игре, Участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

12.2. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них без уплаты им какого-либо вознаграждения могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

12.3. Победители, претендующие на получение призов, обязуются предоставить всю необходимую информацию для их получения, заполнить и подписать необходимые для получения призов документы, а также выполнить все условия и формальности, предусмотренные Правилами.

13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты розыгрыша Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 29.07.2021.

13.3. Имена победителей Рекламной игры будут размещены на Интернет-сайте www.belapb.by.

13.4. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте www.belapb.by, а также по телефонам контакт-центра: 136; +375 17 218 57 77, +375 29 198 57 77, +375 29 888 57 77, +375 25 999 57 77 (с 8 до 20 по будним дням, а также с 8 до 18 по выходным).

14. Общие положения.

14.1. Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

14.2. Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

14.3. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Рекламной игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления рекламных материалов для размещения на сайте Рекламной игры, не требуя за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной игры. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, образы (изображения), аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Все права, в том числе исключительные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору. Участники выражают согласие на сбор и обработку их персональных данных для целей Рекламной игры.

14.4. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при его использовании Участником (например, плохое соединение с провайдером и т. д.) и операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д).

14.5. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

14.6. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

14.7. Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18б, 7-й этаж, к. 25, пом. 701.

Свидетельство № 3941 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 22 февраля 2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ФОРМУЛА ШЧАСЦЯ ДЗМІТРЫЯ І АЛЕНЫ АЛЕПКАЎ

Сужэнцы з Краснаполля перавыхоўваюць нават самых цяжкіх дзяцей

Жыла-была сям'я — маці, бацька, двое дзетак. Але сужэнцы адчувалі, што могуць зрабіць шчаслівымі яшчэ кагосьці. І вось іх жыццё змянілася кардынальна. У сям'і з'явіліся дзеці, якія знаходзіліся на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Браць да сябе падлеткаў з такім статусам не кожны рызыкне. Але Дзмітрый і Алена, напэўна, зроблены з іншага цеста. За 13 гадоў работы ў якасці бацькоў-выхавальнікаў яны падарылі сваю любоў болей чым дваццаці такім вось праблемным дзецям. І працягваюць саграваць сэрцы сваіх новых «дачок» і «сыноў».

ЗНАК ЗВЫШ

Калі трапіла ў іх вялікі дом, спачатку падумала, што памылілася. Так у ім чыста і ўтульна, што ніколі не падумаеш пра вялікую сям'ю. Толькі батарэя роўна выстаўленых дзіцячых боцікаў і чаравікаў нагадвала, што я прыйшла па адрасе.

У хаце пахне пірагамі, і пакуль Улад, якому няма яшчэ і года, спіць, а іншыя дзеці ў садку або школе, ёсць час паразмаўляць за кубачкам кавы і кавалачкам найсмачнейшага торта «Графскія руіны». Гэта фірменная смаката ад Алены Алепкі. Яна наогул часта пестуе сямейнікаў смачненькім, а мне да таго ж пашчасціла завітаць у госці на наступны дзень пасля імянін аднаго з выхаванцаў. Цяпер у Дзмітрыя і Алены 10 дзетак ва ўзросце ад менш чым годзік да 13. У такім вось фармаце яны жывуць год. Дзеці, якіх яны бралі да сябе раней, былі ўжо амаль дарослыя. Ды і пачыналася іх добрая справа нетыпова. На ўсё паўплываў выпадак.

У Краснаполле сужэнцы прыехалі жыць у 2002 годзе, калі тут адкрыўся дзіцячы прытулак. Гэта была іх своеасаблівая хрысціянская місія, бо яны людзі веруючыя. Задача была аказваць дзецям пасільную дапамогу. Яны прыходзілі ў госці, гулялі з малымі, нават запрашалі іх да сябе на выхадныя. Калі прытулак адзначаў пяцігоддзе свайго існавання, дырэктар запрасіў сваіх добраахвотных памочнікаў на свята. Алене тады вельмі запомніўся танец са свечкамі. Дзяўчынкі, нібыта німфы, кружылі па сцэне, а жанчына не зводзіла вачэй з нязграбнай худзенькай Тасі Еўдакімавай. 13-гадовая дзяўчынка выклікала такі прыліў пяшчоты, што Алена не магла нават ноччу заснуць — усё думала пра яе. Прапанову забраць Тасю да сябе ў сям'ю Дзмітрый сустрэў калі не з абурэннем, то з непаразуменнем. «Мы ж гэта не пацягнем», — спрабаваў ён пераканаць жонку.

— Нашы дзеці былі яшчэ зусім маленькія, але мне хацелася сагрэць яшчэ і Тасю, — згадвае Алена падзеі 13-гадовай даўніны. — Яе маці на той момант пазбавілі бацькоўскіх правоў. Дзяўчынку было вельмі шкада. І мужа шкада, ён не мог мяне зразумець, быў у разгубленасці... Дырэктар прытулку таксама адгаворваў, раіў не рызыкаваць, казаў — толькі намучаецеся. Маці Тасі займалася крадзяжамі, дачка яе падстрахоўвала. Маўляў, што атрымаецца з такога дзіцяці? Але я нічога не магла з сабой зрабіць. Патэлефанавала свекрыві. У нас з ёй былі вельмі даверлівыя адносіны. Сама сабе вырашыла: як яна скажа, так і зраблю. Калі яна спыталася: «Няўжо ў цябе не хопіць лішняй талеркі супу?» — я рыдала ад шчасця. Словы маёй свекрыві былі для мяне знакам з неба. Пасля гэтага нават мой муж здаўся. Тасю мы спачатку ўзялі на выхадныя. Потым яна з іншымі дзецьмі паехала ў санаторый, а мы... сумавалі без яе. І яна, як потым высветлілася, таксама. Калі яна вярнулася, мы ўжо сабралі ўсе неабходныя дакументы і забралі дзяўчынку да сябе.

Гэта цяпер Алепкі жывуць разам з дзецьмі ў прыгожым утульным катэджы з усімі выгодамі, а тады ў іх быў дамок, малы нават для чацвярых. Тася была пятай душой, але для яе таксама знайшлося месца. Аднак хутка высветлілася, што ў дзяўчынкі ёсць яшчэ двое старэйшых братоў па крыві. Па ўзросце Алене, якой на той момант было 30 гадоў, яны былі як малодшыя браты. Але маладая жанчына разумела, што нельга разлучаць родных. Хлопцы прыходзілі ў сям'ю на выхадныя, прасілі іх забраць. І Алепкі здаліся. Потым забралі іх сябра Саньку — хлопца ростам пад два метры. Без іх ён быў зусім адзінокі.

Усе дзеці аказаліся здольныя, добра вучыліся. Пасля школы атрымалі вышэйшую адукацыю. Адзін з братоў стаў настаўнікам фізкультуры, другі — прадпрымальнікам. Тася скончыла МДУ імя Куляшова па спецыяльнасці «псіхолаг». Дарэчы, Дзмітрый паступаў ва ўніверсітэт разам са сваёй выхаванкай. Спачатку скончыў факультэт дашкольнай адукацыі, а ўжо потым таксама вучыўся на псіхолага.

ЦЯЖКІЯ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ ДРЭННЫЯ

Раней выхоўваць дзяцей было прасцей, яшчэ не існавала такой моцнай залежнасці ад сацсетак, больш вабілі жывыя адносіны. Дарослыя з дзецьмі бралі сабаку і ішлі ў лес, на прыроду. Палілі вогнішча, спявалі, смяяліся і размаўлялі пра ўсё на свеце. Узроставай розніцы амаль не адчувалася — яны ўсе былі як роўныя. І гэта падабраму разнявольвала.

— Нельга сказаць, што дзеці адразу сталі шаўковыя, — згадвае той перыяд Алена. — Здаралася, нас і ў школу выклікалі. Калі яны рабілі нешта шкоднае, мы з імі размаўлялі, і такога больш не паўтаралася. Яны нас вельмі паважалі.

— Гэтыя першыя нашы дзеці былі ўдзячныя за тое, што мы іх да сябе забралі, — дадае Дзмітрый.

— Для нас яны сталі штуршком, знакам, каб працягвалі працаваць з такімі дзецьмі і далей, — кажа Алена. — Тактыку мы не мянялі, дзеці павінны былі адчуць, што мы іх сябры, памочнікі. Гэта было важна, бо тыя праблемы, што яны перажылі, былі далёка не дзіцячыя. Да нас трапіла дзяўчынка, маці якой магла запіць і дома не з'яўляцца днямі. Пра дачку клапаціліся настаўнікі. Яна сама выклікала міліцыю і збягала ў прытулак. Дома немагчыма было жыць. Аднойчы яна ўкрала ў нейкай бабулі курыцу, каб зварыць і з'есці... Калі яна прыйшла да нас, ёй было цяжка адвыкаць ад гэтага. Мы вучым дзяцей адказнасці, даем ім грошы, каб яны самастойна рабілі пакупкі, ведалі, колькі каштуюць прадукты. Аднойчы яна прыбегла дамоў уся ў слязах. У яе была сапраўдная істэрыка: у руках грошы, а ёй хочацца красці. Мы з ёй доўга, абняўшыся, размаўлялі. Менавіта размова можа вырашыць усе тыя праблемы, якія назапашваюцца ў душы чалавека, яны павінны быць выказаныя. Мы вучым дзяцей не замыкацца. Нічога не можа быць сарамлівага і заганнага, што нельга было б выказаць. У нас ёсць хлопчык, якога бацькі ўцягвалі ў парнаграфію. І ён не можа ўтрымацца, каб не пачаць шукаць у інтэрнэце гэтыя карцінкі. Ён у гэтым нам прызнаецца, і мы разам змагаемся з праблемай. У нас нават малітва ёсць, сэнс якой у тым, што мы так болей жыць не жадаем і просім Бога дапамагчы выправіцца. Па вечарах вось тут, на кухні, за сталом абмяркоўваем пражыты дзень, просім адно ў аднаго прабачэння.

З першымі дзецьмі было прасцей, прызнаюцца сужэнцы, таму што яны самі іх выбіралі. Сёння ў іх дзіцячы дом прыходзяць вельмі розныя выхаванцы. Ёсць сярод іх так званыя дзеці ПДА (маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне), якія знаходзяцца ў сям'і ад тыдня да паўгода. Іх бацькам даюць час рэабілітавацца, каб яны маглі выхоўваць сваіх дзяцей самастойна. Калі нічога не мяняецца, іх пазбаўляюць правоў.

— Дзве сям'і з чатырох, з якіх у нас былі дзеці ПДА, і цяпер з намі на сувязі, — радуецца Алена. — Бацькі стараюцца жыць правільна. Калі такія дзеці трапляюць да нас, наша задача ў першую чаргу дапамагчы бацькам. Не заўсёды атрымліваецца, але спадзяёмся, што некаторым мы ўсё ж адкрылі вочы.

КНІГА ЖЫЦЦЯ І ШКАТУЛКА ЖАДАННЯЎ

Дзмітрый і Алена добра ведаюць: некаторыя дзеці толькі ў іх зразумелі, што такое сапраўдная сям'я. І вельмі хацелася б, каб гэтыя пачуцці заставаліся з імі назаўсёды. Так нарадзілася ідэя рабіць для кожнага выхаванца своеасаблівую Кнігу жыцця.

— Пачыналі проста з фота, — кажа Дзмітрый. — А потым сталі прыкладаць да іх візітоўкі са сціслай інфармацыяй пра дзіця і яго жыццё ў нашай сям'і. У 2014 годзе, калі мы былі ў Мінску на канферэнцыі прыёмных бацькоў, у нас нават папрасілі гэты альбом для пераймання вопыту. Для сябе захоўваем альбомы ў электронным выглядзе і па вечарах усе разам праглядваем. Тут нашы святы, выпускныя, спартыўныя спаборніцтвы, веласіпедныя прагулкі, паходы, паездкі за горад, агародныя справы — усё тое, чым напоўнены кожны дзень.

Са здымкаў глядзяць такія вясёлыя і шчырыя твары, што пачынаеш нават крышачку зайздросціць Дзмітрыю і Алене. Якія ж яны шчаслівыя! Вунь і падзяк колькі за добрае выхаванне дзяцей, за іх поспехі ў конкурсах, спорце. Сужэнцы вучаць выхаванцаў быць моцнымі, ставіць перад сабой мэты і дасягаць іх.

— Дзеці шмат малююць, пішуць нам, у нас ёсць нават шкатулка жаданняў, — кажа Дзмітрый. — Але іх просьбы не павінны быць звязаныя з матэрыяльнымі выдаткамі. Яны просяць для сябе нейкіх духоўных падарункаў. Вось Насця напісала пра Бога. Прызнаецца, што дзень быў цудоўны.

НЯСУМНАЯ ГАСПАДАРКА

Мае суразмоўнікі — гараджане па паходжанні і пра гаспадарку да пэўнага часу мелі вельмі аддаленыя ўяўленні. Аднойчы тутэйшая бабулька падарыла ім курыцу з куранятамі. Алена са смехам згадвае, як яна па няведанні накарміла іх рысам з маслам і цукрам, каб яны хутчэй раслі. Гэта цяпер смешна, а тады, калі амаль вялікія куры пападалі на зямлю ад нястраўнасці, было не да жартаў. А сапраўднае разуменне і цікавасць да гэтых гадаванцаў прыйшла крыху пазней, пасля знаёмства з праваслаўным святаром Уладзімірам, у якога на выхаванні былі сапраўды дзівосныя птушкі... І цяпер у іх саміх якіх толькі летуноў няма, ёсць нават фазаны.

Птушкі і агарод — добрая падтрымка для вялікай сям'і. Летась Алепкі набылі аўтаклаў і робяць смачную тушонку з мяса. Яе нават нельга параўноўваць з той, што з крамы. А летам на іх агародзе спеюць памідоры, агуркі, перцы...

— Сёлета мы нарыхтавалі шмат двухлітровых слоікаў агуркоў, — кажа Алена. — Нашым студэнтам такі памер больш падабаецца. Калі дзеці сыходзяць ад нас, за іх адказвае ўстанова адукацыі. Але яны ўсё роўна едуць да нас, і мы рыхтуем для іх гасцінцы. Грошай заўсёды не хапае, мы не скардзімся і дзякуем Богу, бо ўмеем з нічога зрабіць нешта. Вунь муж падарыў мне кнігу маіх любімых рэцэптаў. Вельмі зручная рэч. А яшчэ мы любім усё ўдасканальваць.

Пасля таго як Дзмітрый вывучыўся на псіхолага, ён сумяшчае абавязкі бацькі-выхавальніка і педагога-псіхолага ў Краснапольскай гімназіі. Ва ўстанове — 480 дзяцей, работы хапае: гэта і практыкаванні, і кансультацыі, і цяжкія дзеці. Алена заўважыла: калі муж пачаў працаваць псіхолагам, стала нават лягчэй. Канфлікты гасяцца да таго, як паспеюць успыхнуць. Атрыманыя веды дапамагаюць не толькі ў рабоце з выхаванцамі, але і ім самім.

— Самае галоўнае — навучыцца любіць, — кажа Дзмітрый. — Калі табе 19 і ты закаханы, гэта зусім іншае. З часам пачынаеш заўважаць больш грунтоўныя рэчы. Камусьці патрэбны словы, камусьці — адчуванні, камусьці — дотыкі — усе мы розныя. Мне падабаецца, калі жонка мяне падбадзёрвае, а ёй падабаюцца запіскі. Мы разам 25 гадоў, а нашае каханне не згасае.

— Калі дапамагаеш адно аднаму — гэта таксама мова любові, — кажа Алена. — Трэба вывучаць чалавека, каб разумець, што яму трэба. Сямейныя скандалы адбываюцца таму, што людзі сталі мала размаўляць. З гадамі, здаецца, трэба станавіцца бліжэй, а людзі аддаляюцца, таму што не гавораць. Калі справа даходзіць да разводу, час садзіцца за стол і не высвятляць адносіны, а аналізаваць, што зрабілі не так. Згадаць, дзе і калі перасталі разумець адно аднаго. Нават здраду трэба дараваць дзеля захавання адносін. Разабрацца, чаму тое адбылося. Калі дараваць немагчыма, трэба сумленна адказаць сабе, ці зможаш ты далей жыць з гэтым чалавекам. Калі не, яго трэба адпусціць, каб не жыць з болем. Мы крыўдзімся, калі не даруем. І гэта таксама небяспечна для здароўя. Трэба грунтоўна працаваць над сабой. Дзеці таксама нам у гэтым дапамагаюць. Праз іх учынкі мяняемся і мы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара і з архіва Дзмітрыя і Алены АЛЕПКАЎ.

Наш культурны асяродак
Жыранделя
Выпуск № 6 (532)

ВЯРТАННЕ «ПАЎЛІНКІ»

ПРЭМ'ЕРНЫ паказ, як абяцаюць, абноўленага спектакля «Паўлінка» чакаецца ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы 3 сакавіка. Гэта стане адкрыццём 101-га тэатральнага сезона, з-за эпідэміі спачатку пастаноўку зможа ўбачыць абмежаваная колькасць гледачоў. Пасля паказы плануюцца яшчэ сем разоў — 6, 7, 14, 21, 25, 27 і 31 сакавіка. Публіцы таксама рыхтуюцца прадставіць спектакль Аляксея Дударава «Вечар». Што ж да рэалій жыцця самога дома тэатральнага мастацтва, то тут разумееш адно — гісторыя працягваецца, а як павернецца яе сюжэт, пакажа час.

Фота з сайта Купалаўскага тэатра.

«Паўлінка» — пастаноўка, якую лічаць візітнай карткай не толькі Купалаўскага тэатра, а і ўсёй беларускай драматургіі. У гэтым творы спалучыліся яскравыя народныя характары, цікавы сюжэт, дасканалая мова класіка беларускай літаратуры і выдатнае майстэрства выканаўцаў. За гады існавання спектакля ўдзел у ім бралі многія выдатныя артысты краіны, для якіх ён станавіўся і школай прафесійнага майстэрства, і магчымасцю паказаць уласны творчы патэнцыял. Аднак наколькі сёлетняя прэм'ера акажацца ўдалай, улічваючы абнаўленне кадраў, пакуль прагназаваць рана.

— Наш новы акцёрскі састаў і ёсць галоўнае абнаўленне «Паўлінкі». І спектакль, і нашы новыя артысты цудоўныя. Усе гараць жаданнем працаваць. У пастаноўку таксама вярнуўся Генадзь Сцяпанавіч Аўсяннікаў, якому яго ролю перадаваў, можна сказаць, з рук у рукі яшчэ Глеб Глебаў. Наш калега некалькі гадоў не іграў у «Паўлінцы», а цяпер зноў, як і маладыя, ірвецца працаваць, — распавядае **мастацкі кіраўнік спектакля Вольга НЯФЁДАВА.** — З-за таго, што ўсе мы засумавалі па рабоце і ў наш тэатр прыйшлі людзі з вялікімі жаданнем тварыць, гэтая «Паўлінка» будзе яркая, з маладой энергетыкай і драйвам. Я таксама хачу выйсці на сцэну і нарэшце займацца любімай справай, бо такой магчымасці я і мае калегі былі пазбаўлены доўгія месяцы. Проста хочацца атрымліваць задавальненне ад сцэны і зноў адчуць тыя непаўторныя эмоцыі, дзеля якіх мы ўсе ідзём у прафесію.

Сярод акцёраў, якія прадставяць спектакль публіцы, будуць сталыя «купалаўцы» — народны артыст Генадзь Аўсяннікаў у ролі Пранцыся Пустарэвіча, Тамара Міронава ў ролі Агаты, народныя артысткі Марыя Захарэвіч і Зінаіда Зубкова. Малады акцёр Міхаіл Світа ўвасобіць на сцэне пана Быкоўскага, Ала Ельяшэвіч — Адэлю. А ў ролі Сцяпана Крыніцкага публіка ўбачыць артыста Васіля Сушыцкага, які служыў у Маладзёжным тэатры. Ролю Паўлінкі выканае студэнтка ўніверсітэта культуры і мастацтваў Анастасія Варанкова. Як адзначала ў інтэрв'ю Вольга Няфёдава, гэтую дзяўчыну яна заўважыла з самага першага кастынгу. Сама артыстка таксама задзейнічана ў спектаклі яшчэ і ў ролі Альжбеты, у якой гледачы маглі бачыць яе раней. Праслухоўванні па адборы новых кадраў пачаліся восенню мінулага года. Дарэчы, і цяпер тут усё яшчэ прымаюць заяўкі ад ахвотных трапіць у тэатральны калектыў... Так, на сайце ёсць інфармацыя, што конкурсны адбор артыстаў розных узроставых катэгорый пройдзе ў Купалаўскім 24 сакавіка 2021 года. Заяўкі з рэзюмэ, партфоліа і відэа прымаюцца да 23 чысла на пошту info@kupalauski.by.

Рэжысёрам «Паўлінкі» цяпер з'яўляецца студэнтка Беларускай акадэміі мастацтваў Зінаіда Вядзеніна.

Білеты на спектакль паранейшаму можна набываць альбо ў тэатральных касах, альбо анлайн на сайце самога тэатра. Цанавы дыяпазон ад 5 да 25 рублёў.

— На першую палову месяца квіткі на спектакль «Паўлінка» актыўна разбіраюць. Пры продажы мы, вядома, арыентуемся на рэкамендацыі па захаванні мер бяспекі, каб не рызыкаваць здароўем гледачоў. Аднак калі людзей, жадаючых трапіць на паказы спектакляў, шмат, то мы адпускаем больш білетаў, — растлумачыла **начальнік аддзела рэалізацыі Кацярына СТАРАВОЙТАВА.** — Дадатковых дат паказу не будзе, а толькі тыя дні, якія ўжо вызначылі. Але калі людзі не змогуць з нейкіх прычын трапіць на паказы ў першую палову месяца, то пакуль ёсць магчымасць набыць квіткі на больш познія даты. Плюс калі будзе попыт, дабавім дадатковыя білеты.

У афішы Купалаўскага сталі даступныя квіткі і на спектакль «Вечар», пастаўлены яшчэ рэжысёрам Валерыем Раеўскім у 2007 годзе, паказ якога плануюць 19, 23 і 30 сакавіка. Тут кошты ад 5 да 15 рублёў і дзеля бяспекі гледачоў колькасць месцаў таксама абмежаваная. У пастаноўцы іграе акцёрскі квартэт — Тамара Міронава, Генадзь Аўсяннікаў, Зінаіда Зубкова і Васіль Сушыцкі. Аўдыторыю чакае шчымлівая гісторыя пра сапраўдныя пачуцці і адносіны паміж людзьмі. Як адзначаецца ў анатацыі да пастаноўкі, «гэты спектакль — падзяка за магчымасць жыць, адчуваць дабрыню і цяпло свету... Філасофскі роздум пра тое, як да апошняй хвіліны свайго жыцця заставацца чалавекам».

Алена ДРАПКО.

Кніжная паліца

Палескі выбар свабоднага мастака

Што ўражвае ў кнізе з серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», якая прысвечана народнаму пісьменніку Беларусі Івану Мележу?.. Прыцягвае, зразумела, сама постаць персанажа, героя выдання. Здараецца часам і так, што для кніг серыі выбіраюцца тыя постаці, якія і не самыя «знакамітыя». Рэдка, але ўсё ж такі здараецца. Альбо бывае і такое, што зборнік нарысаў, артыкулаў, інтэрв'ю, кароткіх успамінаў, прысвечаных ім, зроблены, што называецца, без душы.

З кнігай «Іван Мележ. Пясняр Палесся» ўсё склалася іначай. І герой — чалавек, асоба, якіх яшчэ пашукаць! І ўкладанне зроблена вартаснае, разлічанае на рэльефнае, глыбокае адлюстраванне жыцця і творчасці народнага пісьменніка, лаўрэата Ленінскай прэміі, аўтара неўміручых раманаў «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы». Пра Івана Паўлавіча расказваюць блізкія людзі, тыя, хто ведаў яго змалку, у маладосці, расказваюць пісьменнікі, якія жылі і працавалі побач.

А ўражваюць нераўнадушша, чалавечнасць, дабрыня, справядлівасць, з якімі ішоў праз усё сваё жыццё Іван Мележ. Чалавек просты і знешне не вельмі кідкі, здавалася б, зусім звычайны, пазбаўлены яркіх фарбаў і колераў... Вось што ўспамінае Барыс Сачанка: «Што толькі ні хвалявала Івана Паўлавіча! Бярозы па дарозе ў родную вёску павысякалі — не мог некалькі дзён супакоіцца.

— Стаяць яны ў мяне ўваччу... І дарога тая ў абсадах стаіць... А прыехаў цяпер... Гола, нецікава...

Балоты паасушвалі ў знаёмых змалку мясцінах. Радавала гэта Івана Паўлавіча. А паехаў аднойчы дадому, убачыў тыя ямы, адкуль павыбіралі торф, раззлаваўся:

— Гэта ж трэба, каб такое нарабіць на балотах... Як свінні ўсё адно рыліся... То хоць балота было, аблога... А цяпер што? Жудасць...

Хвалявала яго і тое, што крытыка наша не заўважае многіх добрых з'яў у літаратуры, а піша пра творы сярэднія, а то і пасрэдныя.

— Няма ў нашай крытыцы пакуль што дбаласці, чуласці... Ніяк не навучацца крытыкі бачыць усю літаратуру, бачаць толькі асобныя астраўкі...»

І яшчэ: «Вельмі клапаціў яго «ЛіМ», тое, што ў газеце, якая фарміруе літаратурную думку, друкуюцца часам неабавязковыя, выпадковыя артыкулы, якія не карысць прыносяць, а нават шкоду. Неаднойчы гаварыў ён і пра наша выдавецтва, якое выпускае мастацкую літаратуру, — на пісьменніцкіх сходах, пленумах і ў размовах на самых розных узроўнях. Хвалявала яго, што выдаецца, а то і перавыдаецца не заўсёды лепшае, што кніжны рынак навадняецца падробкамі пад літаратуру.

— Не так багата ў людзей вольнага часу, каб абы-што чытаць. Ашчаджаць яго трэба, не псаваць мастацкі густ».

У кнізе «Іван Мележ. Пясняр Палесся», якую для выдавецтва «Мастацкая літаратура» ўклаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь паэт і зямляк Мележа Мікола Мятліцкі, — тры раздзелы. У першым — «Ёсць на Палессі Курані» — успаміны родных, блізкіх людзей, пісьменнікаў-землякоў, тых, хто працаваў поруч з Іванам Паўлавічам, сябраваў. Другі раздзел — «Пуцявінамі лёсу» — складаюць тэксты беларускіх пісьменнікаў, якія і па духу былі блізкія да Мележа, і часта сустракаліся з ім. Такое, пэўна, здараецца не часта, каб у адной кнізе, у адным раздзеле сышліся аўтары вельмі вядомыя, знакавыя ў беларускай літаратуры, пісьменнікі, творы якіх на слыху, перад вачыма чытачоў розных пакаленняў: Мікола Лобан, Алена Васілевіч, Васіль Вітка, Юльян Пшыркоў, Мікола Аўрамчык, Янка Брыль, Генадзь Бураўкін, Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Уладзімір Ліпскі, Мікола Матукоўскі, Павел Пруднікаў, Ян Скрыган, Іван Шамякін, Генадзь Шупенька, Вера Палтаран. Пісьменнікі, якіх можна смела залічваць да сумлення беларускай нацыянальнай літаратуры. Хто чытае па-беларуску, хто імкнецца ведаць родную літаратуру, канешне ж, адкрываў кнігі ці не кожнага з іх. Завяршае зборнік раздзел «Раман — гэта народ», у якім развагі пра прозу Івана Мележа, здзейсненае ім у літаратуры выкладаюць крытыкі, літаратуразнаўцы, публіцысты, сярод якіх — Алесь Адамовіч, Уладзімір Гніламёдаў, Рыгор Бярозкін, Таццяна Шамякіна...

Уражваюць нераўнадушша, чалавечнасць, дабрыня, справядлівасць, з якімі ішоў праз усё сваё жыццё Іван Мележ. Чалавек просты і знешне не вельмі кідкі, здавалася б, зусім звычайны, пазбаўлены яркіх фарбаў і колераў...

З Іванам Шамякіным і Пятром Машэравым.

Нарыс народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля пра свайго сябра Івана Мележа заканчваецца такімі словамі: «Ці ўсё мы робім якраз тое, што нам належыцца рабіць, ці самае найважнейшае робім? Як жа нам нялёгка разабрацца ў гэтым, быць паслядоўным у найважнейшым напрамку!..

І я схільны думаць, што замест бясконцага дапрацоўвання «Мінскага напрамку» Івану куды лепш было б канчаць «Палескую хроніку»... Думалася так пры яго жыцці, з асаблівым шкадаваннем думалася і тады, калі мы, камісія па Мележавай спадчыне, знаёміліся з накідамі да новых частак і кніг яго эпапеі, тых накідаў, якія поўнасцю, улічваючы і публікацыю ў «Полымі», яшчэ не вядомыя чытачу. Думаецца так і цяпер, і воддаль ад старонак яго кніг, і перачытваючы іх, дзе з хваляваннем, а дзе і без яго...

Аднак і такое на думку прыходзіць, на гэтым, урэшце, спыняешся: гэта ж яго была справа, яго гаспадарка, яго свабода выбару...»

І ўсё ж у межах свайго выбару ён, вялікі беларускі пісьменнік сучаснасці, адбыўся як свабодны мастак, як свабодны чалавек. Іначай бы яго не помнілі, іначай бы Палессе і саму нашу краіну ў свеце не адкрывалі па яго раманах.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

На светлы ўспамін

ВА ЎСІХ СІТУАЦЫЯХ ІМКНУЎСЯ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ШЛЯХЕТНА

Лебядзінай песняй дырыжора Вашчака стала пастаноўка оперы па аповесці Караткевіча

Сёння мінчукі і госці беларускай сталіцы, ідучы па вуліцы Куйбышава, прыпыняюць крокі каля дома № 10. На ім прымацавана мемарыяльная шыльда, што на гэтым месцы стаяў будынак, дзе 120 гадоў таму неаднаразова спынялася знакамітая ўкраінская пісьменніца Леся Украінка. Аднак мала хто ведае, што якраз у гэтым доме з 1972 да 1989 года жыў і працаваў оперны дырыжор еўрапейскага ўзроўню, народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Яраслаў Антонавіч Вашчак. Мемарыяльнай шыльды, якая сведчыла б пра гэта, на доме яшчэ няма.



Яраслаў Вашчак, стагоддзе якога адзначаецца сёлета ў лютым, нарадзіўся ў горадзе Броды Львоўскай вобласці. Скончыў у Львове Вышэйшы музычны інстытут імя Лысенкі, нейкі час выступаў як віяланчэліст у аркестры Львоўскай оперы, а з 1944 года, пасля вызвалення Украіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, стаў дырыжорам. З 1953 года — галоўным дырыжорам Львоўскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя Івана Франко (цяпер — імя Саламеі Крушальніцкай). Працаваў у гэтым тэатры да 1963 года, атрымаў званні заслужанага, а пасля і народнага артыста Украіны. Сёння люстэркавую залу Львоўскай оперы ўпрыгожвае і пазалочаны бюст Яраслава Вашчака (побач з такім жа бюстам Саламеі Крушальніцкай)...

Пасля Львова працаваў у музычных тэатрах Адэсы, Грознага, Варонежа, ажыццяўляў пастаноўкі асобных опер у Казані, Уфе. І ўсюды заўважаўся вашчакоўскі творчы стыль. У яго, як адзначалі музыказнаўцы, уваходзілі асаблівая харызма, інтэлігентнасць і любоў да выканаўцаў, здольнасць «гарэць» самому і «запальваць» да сутворчасці іншых, імкненне прасачыць душэўныя перажыванні і раскрыць унутраныя супярэчнасці герояў. У гэтым дырыжору дапамагала ўнікальная музычная памяць і каласальная інтуіцыя. А яшчэ ён кожны раз імкнуўся ўстанавіць сувязь тэатральнай сцэны з залай. Любіў паўтараць, што без гэтага «...не будзе і катарсісу — таго моманту высокага суперажывання, які і ёсць мэта мастацтва». Творчы стыль Вашчака вызначаўся і яго падтрымкай шматнацыянальнага музычнага мастацтва. Ён здзейсніў першапрачытанні твораў многіх маладых украінскіх кампазітараў на сцэне Львоўскай оперы. Кіруючы сімфанічным аркестрам у Грозным, смела браўся за выкананне чачэнскай, інгушскай і татарскай музыкі. У Варонежы «першапрачытаў» оперы рускіх кампазітараў Малчанава «Руская жанчына», «Брэсцкая крэпасць» і Хрэннікава «У буру». У Башкірскім тэатры ва Уфе паставіў нацыянальную оперу «Салават Юлаеў» Ісмагілава, у Мінску — оперу «Міндыя» грузіна Тактакішвілі...

Сцэна з оперы «Дзікае паляванне караля Стаха».

Бюст Яраслава Вашчака ў Львоўскім оперным тэатры імя С. Крушальніцкай.

У 1972 годзе на запрашэнне Пятра Машэрава Вашчак прыехаў у Мінск з наказам узняць узровень беларускага опернага мастацтва. Тут да самай смерці яго творчае жыццё было звязана з Дзяржаўным тэатрам оперы і балета Беларусі (цяпер — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі), які ён у 1972—1980 гадах узначальваў як галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік. У Беларусі Вашчак атрымаў высокае званне народнага артыста СССР (1979).

Можна смела казаць пра «вашчакоўскі этап» у гісторыі беларускага опернага тэатра, якому дырыжор аддаў сямнаццаць сваіх найлепшых гадоў. У Мінску ён ажыццявіў свае галоўныя творчыя задумы — паставіў «Барыса Гадунова» Мусаргскага, «Дона Карласа» і «Аіду» Вердзі, балеты «Ленінградская сімфонія» Шастаковіча, «Спартак» Хачатурана, «Кармэн-сюіту» Бізэ — Шчадрына і іншыя. У кожнай пастаноўцы выяўляўся ягоны густ. Выразна размяжоўваючы драматургію музычную і сцэнічную, ён дабіваўся не толькі, нават не столькі выдатнага гучання голасу саліста ці інструмента, а высокай духоўнасці, эмацыянальнасці гуку. Адна прысутнасць Вашчака ў тэатры не дазваляла нікому расслабляцца, працаваць напаўсілы.

Няпросты жыццёвы і творчы лёс быў у Яраслава Вашчака. Няпросты, складаны быў і ён сам, чалавек шырокай, я сказаў бы, караткевічаўскай, натуры, рамантык-максімаліст. Але ва ўсіх сітуацыях імкнуўся дзейнічаць шляхетна, інтэлігентна (любімае яго слова). Не прызнаваў ніякіх кампрамісаў, калі пры гэтым трэба было паступацца вядучымі мастацкімі прынцыпамі. Таму незычліўцаў у яго было нямала. Аднак не памятаў зла, тым больш ніколі не помсціў.

Асабліва патрабавальна ставіўся ён да аркестрантаў і салістаў. Але ўсё ўрэшце аплачвалася высокім выканальніцкім майстэрствам. За «вашчакоўскую вывучку» ўдзячныя многія з іх. Як, у прыватнасці, народны артыст Беларусі Віктар Скорабагатаў, пра што ён сказаў у цікавым артыкуле «Наказы Вашчака». Ці як сусветнавядомая спявачка, прымадонна Марыя Гулегіна, якая пачынала сваю творчую кар'еру на сцэне Беларускай оперы. Неаднойчы яна падкрэслівала, што «ўдзячная Беларусі, у тым ліку Ракаўшчыне. Пасадзейнічала кантактам тое, што Яраслаў Вашчак і мой цесць Вячаслаў Кабржыцкі разам калісьці працавалі ў Львоўскім тэатры оперы і балета, нават разам атрымалі званні заслужаных артыстаў Украіны (Вашчак як дырыжор, Кабржыцкі як саліст, выканаўца ролі Ёнтака ў оперы «Галька» Манюшкі). Вашчак з глыбокай сімпатыяй ставіўся да беларускай гісторыі, культуры, мовы, радаваўся духоўнай блізкасці ўкраінскага і беларускага народаў. Сапраўдны інтэрнацыяналіст, ён цешыўся кожным творчым поспехам беларускіх кампазітараў, артыстаў, пісьменнікаў, музыкаў, мастакоў. І мы адзін аднаго добра разумелі, хоць гаварылі на розных мовах: ён звычайна па-ўкраінску, я — па-беларуску. Хочацца верыць, што тыя нашы гутаркі схілілі яго, напачатку далекаватага ад патрэб уласна беларускага опернага мастацтва, прыняць самы чынны ўдзел у стварэнні нацыянальных спектакляў.

Аднаго разу мы з Таццянай Вячаславаўнай Кабржыцкай у нашай мінскай кватэры пазнаёмілі Яраслава Вашчака з Уладзімірам Караткевічам (мы тады сябравалі і жылі з ім у адным доме па вуліцы Карла Маркса, 36). З таго часу дырыжор захапіўся і творчасцю, і самой асобай пісьменніка. У 1978 годзе горача падтрымаў пастаноўку на опернай сцэне оперы Смольскага «Сівая легенда» паводле аповесці і лібрэта самога Караткевіча. А колькі часу, творчай энергіі, ведаў ён аддаў і іншым сваім малодшым калегам, рыхтуючы іх творы да пастаноўкі! Маю на ўвазе кампазітара Картэса і лібрэтыста Халіпа ў перыяд іх напружанай працы над операй «Джардана Бруна». А з якім настаўніцкім цярпеннем і ўважлівасцю ён паставіўся да кампазітара Кандрусевіча, як зацікаўлена дапамагаў дасканаліць музыку яго балета «Крылы памяці»!

Апошнія два гады жыцця Вашчак нястомна працаваў яшчэ з адным маладым беларускім кампазітарам, Солтанам, і лібрэтысткай Клімковіч, рыхтуючы разам з імі да пастаноўкі оперу «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле вядомай аповесці Караткевіча. Самога пісьменніка, на жаль, ужо не было ў жывых. Але ранейшыя сустрэчы, размовы з ім, у тым ліку на Ракаўшчыне, куды мы калісьці зрэдку выязджалі ці на маіх «жыгулях», ці на чырвоным «жыгулёнку» самога дырыжора, жывілі яго памяць, зараджалі творчай энергіяй. А тое і другое вой як патрэбна было! Бо Яраслаў Антонавіч захварэў на самую страшную хваробу веку. Але не адмовіўся ад працы над пастаноўкай оперы паводле твора Караткевіча. Нават пасля хіміятэрапіі адпрошваўся ў дактароў і на сваім нязменным «жыгулёнку» ехаў з Бараўлян у тэатр, гутарыў з рэжысёрам-пастаноўшчыкам і мастаком спектакля, выканаўцамі галоўных роляў, праводзіў рэпетыцыі... Пастаноўка гэтай оперы стала яго лебядзінай песняй. Ёю ён штодзённа жыў, пра яе ўвесь час думаў і гаварыў нават за дзве гадзіны да смерці. Не хапіла яму крыху менш месяца, каб парадавацца апошняй у ягоным жыцці прэм'еры.

Магіла Яраслава Вашчака на Паўночных могілках Мінску.

Спектакль «Дзікае паляванне караля Стаха» стаў адной з самых яркіх старонак у гісторыі беларускага опернага мастацтва. Праз год пасля прэм'еры (1990) вялікі калектыў яго пастаноўшчыкаў, у тым ліку Яраслаў Вашчак (пасмяротна), быў узнагароджаны высокай Дзяржаўнай прэміяй Беларусі.

Вячаслаў РАГОЙША, доктар філалагічных навук, прафесар БДУ.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОДОЛЖЕНИИ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ, ПОСТУПЛЕНИИ И РАСХОДОВАНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ И ИНОГО ИМУЩЕСТВА ЗА 2020 ГОД

В соответствии с частью шестой статьи 24 Закона Республики Беларусь «Об общественных объединениях», на основании статьи 9-2 Закона Республики Беларусь от 30 июня 2014 г. № 165-З «О мерах по предотвращению легализации доходов, полученных преступным путем, финансирования террористической деятельности и финансирования распространения оружия массового поражения» Международное благотворительное общественное объединение помощи животным «Суперкот» направляет соответствующую информацию о своей деятельности, в том числе информацию о поступлении и расходовании денежных средств и иного имущества с целью доведения до всеобщего сведения путем размещения (публикации) в газете «Звязда» № 38 от 27.02.2021 г. и на официальном Интернет-портале Министерства юстиции.

1. МБООПЖ «СУПЕРКОТ» продолжает осуществлять свою деятельность по юридическому адресу – г. Минск, проспект Независимости, 58, пом. 9.

2. По состоянию на 1 января 2021 г. численность членов МБООПЖ «Суперкот» – 18 человек. Из них проживающих в городе Минске – 15 человек, на территории Федеративной Республики Германии – 3 человека.

Выборные органы:

- Правление МБООПЖ «Суперкот» – 3 человека, во главе правления МБООПЖ «Суперкот» – председатель правления.

- Ревизионная комиссия МБООПЖ «Суперкот» – 3 человека, во главе ревизионной комиссии – председатель ревизионной комиссии.

Состав МБООПЖ «Суперкот», состав правления МБООПЖ «Суперкот», состав ревизионной комиссии МБООПЖ «Суперкот» без изменений.

3. За отчетный период проведены следующие мероприятия:

а) забрано из пункта временного содержания УП «Фауна города» в приют объединения 544 кота (включая котят до 1 года) и 44 собаки (включая щенков до 1 года) с целью их последующей передачи физическим лицам для содержания и ухода на постоянной основе;

б) содержание и ежедневный уход за животными в приюте объединения и за его счет;

в) проведено более 800 онлайн-консультаций физических лиц по вопросам содержания животных и ухода за ними;

г) привлекали ветеринарные клиники для консультаций владельцев животных и оказания ветеринарной помощи;

д) передано физическим лицам для содержания и ухода на постоянной основе из числа забранных животных с УП «Фауна города» 424 котов (включая котят до 1 года) и 37 собак;

ж) регулярно проводится, один раз в неделю, онлайн-трансляция в социальной сети «Инстаграм» из приюта с целью ознакомления населения с особенностями содержания и ухода за животными, рассказами о животных, их особенностях, информирования граждан о животных, которым объединение ищет дом;

з) члены объединения принимают информационное участие в поисках пропавших домашних животных, проводят консультации по поиску и предотвращению подобных ситуаций;

и) сотрудничаем со СМИ по предоставлению информации, касающейся защиты животных, предотвращения случаев жестокого обращения с животными;

к) ведем информационную работу на тему защиты животных и разъяснения основ волонтерской деятельности в социальной сети «Инстаграм» (https://www.instagram.com/superkot_by/);

л) ведем информационную работу на тему защиты животных и популяризации основ волонтерской деятельности в социальной сети «ВКонтакте» (https://vk.com/superkot_by);

